ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЭЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Менскага гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня XV
№ 71 (4323)
АЎТОРАК, 29 сакавіка
1932 г.

МЕНСК, Савецкая 63

Сёньня ў нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Работу ЛКСМБ—на вышэйшую ступень.

ДЖЭЛЮК, ДАМАРАЦКІ, СІМХОВІЧ — Рашуча змагацца з кулацка-рацкімі тэндэнцыямі. (2 стар.).

В. ЯКАБСОН — Фарсаваць падрыхтоўку да навігацыі. (3 стар.).

Узьняць тэмпы падрыхтоўкі да сяўбы ў аднаасобным сэктары.

КІТАЙ. — 5 пасяджэньняў «мірнай канфэрэнцыі» скончыліся безрэзультатна. (1 стар.).

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА. Абмен камсамольскіх білетаў падпарадкаваць задачам павышэньня ролі ячэйкі на гаспадарчым і культурным фронце. (2 стар.).

Пастанову ЦК ад 26 сакавіка — у калгасныя масы. (2 стар.).

Неадкладна скончыць рэарганізацыю загатоўчага апарату. — Растуць рады ўдарнікаў лясного фронту. — Прыйсьці да другога кварталу з перамогамі барацьбы за прамфінплян. (3 стар.).

Голад у Заходняй Беларусі. (4 стар.).

ПЛЯЦІДЗЕНЬНІК БЮРО СКАРГА Ў. — Выпруціць бюракратызм з савецкіх установаў (з матар'ялаў рэйду брыгад ЦККК-НК РСІ і «Зьвязды»).

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі. (4 стар.).

РАБОТУ ЛКСМБ--НА ВЫШЭЙШУЮ СТУПЕНЬ

Камсамол Беларусі мае пэўныя паказальнікі сваёй работы на разе важнейшых вучасткаў сацыялістычнага будаўніцтва. Пад кіраўніцтвам КП(б)Б камсамол значна ўзрос і умацаваўся, удзельная вага яго ў вырашэньні чарговых задач гаспакорчага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва БССР павышаецца. На многіх прадпрыемствах, ваўчасах і калгасах камсамольцы знаходзяцца ў перадавых радах барацьбы за прамфінплян, за ажыцьцяўленьне вуглавых задач сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, за выкананьне бягучых гаспадарча-палітычных кампаній, актыўна памагаючы ў гэтым партыйнай арганізацыі.

Разам з тым, як гэта падкрэслена XIV зьездам КП(б)Б, у рабоце ЛКСМБ цягнучан рад **сур'ёзьнейшых недахопаў.** З усёй паўнатой гэтыя недахопы [illegible] выяўлены праведзеным камітэтам ЛКСМ глыбокім абмеркаваньнем работы беларускай камсамольскай арганізацыі.

Вынікі абсьледаваньня перш за ўсё паказваюць, што былое кіраўніцтва камсамолу Беларусі аказалася нацыянальна-бальшавіцку ўзначаліць узрастаючую актыўнасьць камсамольскіх мас і забясьпечыць перабудову работы ва ўсіх звеньнях арганізацыі ў адпаведнасьці з новай абстаноўкай і задачамі, якія з усёй выразнасьцю вахарактарызаваны правадыром партыі тав. Сталіным.

Былое кіраўніцтва ЛКСМБ не ўсьвядомла складанасьці задач сучаснага этапу сацыялістычнага будаўніцтва і вынікаючай адсюль неабходнасьці максымальнай арганізаванасьці работы, выразнасьці і апэратыўнасьці кіраўніцтва, не забясьпечыла шырокага разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі, як важнейшага сродку пасьпяховай барацьбы з усякімі апартуністычнымі скажэньнямі лініі партыі. Замест выразнай бальшавіцкай работы па забясьпячэньні канкрэтнага апэрацыйнага кіраўніцтва, сярод кіруючых работнікаў апарату ЦК ЛКСМБ на працягу доўгага часу вялася **бясплэнцыянная групавая барацьба.** Гэта барацьба вылілася ў тое, што ў складзе бюро ЦК ЛКСМБ арганізаваліся дзьве групы. Групоўшчына не заставалася толькі ў сьценах ЦК ЛКСМБ, а і закранала паасобныя зьвены камсамольскай арганізацыі. **Партыйныя арганізацыі ня зусім своячасова рэагавалі на гэтыя нездаровыя зьявішчы.**

Такое становішча, якое мела месца ў ЦК ЛКСМБ да часу **зьмены яго кіраўніцтва,** не магло не адбівацца на стане работы камсамольскай арганізацыі. Былое кіраўніцтва ня бачыла слабых месц у рабоце арганізацыі і своячасова не рэагавала на іх. Замест канцэнтрацыі ўвагі камсамольскіх мас на задачах ажыцьцяўленьня 6 умоў КВ. Сталіна, бюро ЦК ЛКСМБ высунула ад сябе 11 умоў, зусім абыйшоўшы такія пытаньні, як арганізаваны набор рабочай сілы, барацьба за палянізацыю культурнага і матар'яльна-бытавога абслугоўваньня рабочых і інш.

У рэзультаце і да гэтага часу ў разе камсамольскіх арганізацый умовы тав. Сталіна не пакладзены ў аснову ўсёй работы. У практыцы раду арганізацый ЛКСМБ яшчэ і да гэтага часу пераважае дэкларацыйнасьць, пустазьвонства, за якімі хаваецца бязьдзейнасьць. Камсамольцы на вытворчасьці далёка няпоўнасьцю ахоплены сацыялістычнымі і ўдарніцтвам. Напрыклад, на разе менскіх прадпрыемстваў працуе мэтадамі сацыялістычнага і ўдарніцтва ня больш 40-50 проц. камсамольцаў. Гаспадарча-разрахунковыя брыгады моладзі працуюць слаба з прычыны невыстарчальнага кіраўніцтва імі з боку ячэек і камітэтаў ЛКСМБ.

ЦК УсеЛКСМ і V пленум ЦК ЛКСМБ у сваіх пастановах аб выніках абсьледаваньня скансэнтравалі ўвагу беларускага камсамолу на ліквідацыі выяўленых недахопаў, на задачах павышэньня ўдзелу камсамолу ва ўсіх галінах гаспадарчага і нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Гэтыя задачы з усёй паўнатой і выразнасьцю адрэсаваны ў выступленьні тав. **Жаброўскага** на пленуме ЦК ЛКСМБ.

У галіне барацьбы за прамфінплян, за больш фарсавае разьвіцьцё тых галін прамысловасьці, якія зьяўляюцца ва ўмовах Беларусі вядучымі галінамі, ад камсамолу перш за ўсё патрабуецца **сапраўдная перабудова работы** на аснове поўнай рэалізацыі пасыці ўмоў тав. Сталіна і перавод ўсёй работы на рэйкі сацпаборніцтва і ўдарніцтва. Камсамол павінен зрабіць усё, каб пры наяўных матар'яльных сродках, пры максымальнай мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў даваць краіне больш прадукцыі і лепшай якасьці, каб выканаць вытворчую праграму чацьвертага, заключнага году пяцігодкі.

Выкананьне народна-гаспадарчага пляну 1932 году знаходзіцца ў простай залежнасьці ад работы транспарту, ад выкананьня ім плянаў перавозак. Таму барацьба за павышэньне тэмпаў работы транспарту на аснове ўзмацненьня працоўнай дысцыпліны, за ўмацаваньне спаранай язды, больш рацыянальнае выкарыстаньне паравознага і вагоннага парку зьяўляецца базавой задачай ня толькі чыгуначных камсамольскіх арганізацый, а ўсяго ЛКСМБ.

Абсьледаваньнем работы камсамолу выяўлена, што арганізатарская роля вясковых ячэек ЛКСМБ, як праводзьніка партыйнай лініі ў справе арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, яшчэ невыстарчальная. Камсамольская арганізацыя яшчэ не падышла шчыльна да вырашэньня гэтай цэнтральнай задачы калгаснага будаўніцтва. Слаба праводзіцца работа па арганізацыі вытворчых брыгад, па ўкараненьні зьдзельшчыны, ліквідацыі абязьлічкі і ўзмацненьні працоўнай дысцыпліны на аснове разгортваньня масавай выхаваўчай работы ў калгасах. Таму ва ўсёй шырыні стаіць задача перад камсамолам і вясковымі партарганізацыямі **ўзмацненьня калгаснай ячэйкі ЛКСМБ,** забясьпячэньня павышэньня яе ўплыву на работу калгасаў.

Камсамол абавязан змагацца за моцную вытворчую брыгаду з пастаянным складам калгасьнікаў, прымацаваную да поўнага вучастку на ўвесь перыяд с.-г. робот, троба забясьпечыць правільную расстаноўку камсамольскіх сіл на вытворчых вучастках, вылучыць у склад брыгадзіраў актыўнейшых камсамольцаў — лепшых ударнікаў арганізацыі працы ў калгасах. Цэнтр цяжару масавай работы павінен быць перанесен у нізавое вытворчае зьвяно — брыгаду, вучастак.

Пытаньні арганізацыі працы ў калгасах, ліквідацыі абязьлічкі і ўраўнілаўкі, правільнага ўліку і плянаваньня, выхаваўчай работы сярод калгасьнікаў па перамаганьні кулацкіх і індывідуалістычных перажыткаў — зьяўляюцца **рашаючымі** мерапрыемствамі па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў. На гэтай аснове ў бязьлітаснай барацьбе супроць кулака, у яго далейшай ліквідацыі на аснове разгортваньня суцэльнай калектывізацыі, супроць правага апартунізму — галоўнай небясьпекі на даным этапе і «лявацкіх» загібаў — забясьпечваюцца далейшы посьпехі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. На гэтай аснове забясьпечваецца пасьпяховае правядзеньне трэцяй бальшавіцкай вясны, посьпехі барацьбы за ўраджай, за пашырэньне плошчы пасевам тэхнічных культур, за разьвіцьцё сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

У барацьбе за вырашэньне агульных задач сацбудаўніцтва, важнейшай сустаўной часткай гэтай барацьбы зьяўляецца вяўчылае ажыцьцяўленьне ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі. КП(б)Б у рашучай барацьбе супроць ухілу да вялікадзяржаўнага шавінізму, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць нацыянал-апартунізму — агентуры беларускага контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму і шавінізмаў іншых колераў забясьпечыла вялізарныя посьпехі ў справе нацыянальна-культурнага будаўніцтва БССР. Роля камсамолу ў гэтай барацьбе вялікая.

Аднак, троба адзначыць, што ў разе як партыйных, так і камсамольскіх арганізацый маюць месца фармальныя адносіны да правядзеньня беларусізацыі, не заўсёды своячасова рэагуецца на факты пасыўнага і актыўнага супраціўленьня беларусізацыі. Работа ў разе зьвяньняў камсамольскай арганізацыі па вырашэньні задач нацыянальна-культурнага будаўніцтва далёка не на належнай вышыні.

Камсамольская арганізацыя павінна павярнуцца ўсёй сваёй масай да гэтага важнейшага вучастку работы, сур'ёзна заняцца праблемай пралетарскай літаратуры, значна больш узмацніць сваю ўвагу да ідэалёгічнага кавуковага фронту, павысіць сваю клясавую пільнасьць у барацьбе на гэтым фронце. «Выразнае правядзеньне ленінскай пастаноўкі пацыятаньня, глыбокае вывучэньне прац Леніна, Сталіна па нацыянальным пытаньні, рашучая, непрымірымая барацьба з ухіламі ў нацыянальным пытаньні — вось што павінна пранізаць работу камсамольскай арганізацыі» (Жаброўскі). Барацьба супроць ухілаў у бок вялікадзяржаўнага шавінізму і ў бок беларускага шавінізму і прымірэньцтва да іх павінна насіць разгорнуты характар.

Павышэньне ўдзелу камсамолу ў далейшым ажыцьцяўленьні задач сацыялістычнага будаўніцтва, павышэньне яго бакцэльнасьці на ўсіх вучастках клясавай барацьбы патрабуе карэннага палепшэньня кіраўніцтва яго работай з боку ўсіх мясцовых партарганізацый.

Такое кіраўніцтва з боку некаторых партыйных камітэтаў, якое заключацца толькі ў заслухоўваньні дакладаў аб камсамольскай рабоце і вынясьненні агульнага зьместу пастановы, без забясьпячэньня выкананьня гэтай пастановы, без праверкі выкананьня дырэктыў, ня ёсьць кіраўніцтва па сутнасьці, а толькі па форме. Такое кіраўніцтва, зразумела, партыю ні ў якім разе задаволіць ня можа.

Арганізацыя камсамолу Беларусі толькі за мінулы год вырасла больш чым на 80.000 чал. Гэты рост зьяўляецца адным з паказальнікаў вялізарнейшага ўплыву партыі на рабочыя і працоўныя масы, усё ўзрастаючай іх актыўнасьці ў барацьбе за набудову сацыялістычнага грамадзтва. У сувязі з такім ростам пашыраюцца маштабы работы камсамолу і разам з тым прад'яўляюцца да яго большыя патрабаваньні. Перш за ўсё патрабуецца ўзмоцненая выхаваўчая работа.

Замацаваць рост новага папаўненьня камсамолу, г. зн. шырока разгарнуць работу па марксыцка-ленінскім выхаваньні новага папаўненьня — **«ў духу гераічных традыцый бальшавізму, узьняць яго ідэйна-палітычны ўзровень, выхаваць яго ў духу разуменьня інтэрнацыянальных задач, якія стаяць перад пралетарыятам СССР, уцягнуць яго ў штодзённую работу камсамолу, выхаваць у ім стойкасьць і ініцыятыву ў барацьбе за вырашэньне сацыялістычных задач»** (Постышаў). У гэтым цэнтральная задача ўнутрысаюзнай работы. Побач з гэтым неабходна перадавых камсамольцаў больш рашуча ўцягваць у рады партыі, бо павялічэньне парт'яцра ў камсамоле зьяўляецца важнейшай умовай узмацненьня партыйнага кіраўніцтва яго работай.

Работа па бальшавіцкім выхаваньні новых кадраў камсамолу павінна спалучацца са штодзённай практыкай, са штодзённай барацьбой за ажыцьцяўленьне тістарычных пастаноў XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі аб набудове ў кашцы другой пяцігодкі бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва. Гэта патрабуе ад камсамолу рашуча выкрываць усякія спробы пранікнуць праваапартуністычныя тэорыі аб «плаўным ходзе», спробы сьцьвярджаць, што ў другой пяцігодцы клясавая барацьба будзе аслабляцца, тады, як партыя ўказала, што і ў другой пяцігодцы клясавая барацьба будзе абвастрацца ў асобных раёнах і ў паасобных пэрыяты. У камсамоле троба выкрываць апартуністычную недаацэнку неабходнасьці ўмацаваньня дыктатуры пралетарыяту.

Кампанія па абмене камсамольскіх білетаў, якая зараз праводзіцца, павінна быць у максымальнай меры выкарыстана для хутчэйшай ліквідацыі тых недахопаў, якія ёсьць у рабоце арганізацый ЛКСМБ, для бальшавіцкай мабілізацыі камсамольскіх мас на выкананьне пастановы ЦК УсеЛКСМ і пленуму ЦК ЛКСМБ аб далейшых задачах работы камсамольскай арганізацыі Беларусі.

Партыйныя і камсамольскія арганізацыі павінны па-бальшавіцку забясьпечыць правядзеньне гэтага важнейшага палітычнага мерапрыемства, цалкам падпарадкаваць кампанію па абмене білетаў задачам павышэньня тэмпаў і якасьці работы камсамолу на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, не дапускаючы ператварэньня гэтай кампаніі ў чыстку камсамолу, а таксама ў простае тэхнічнае мерапрыемства.

Прымежнае становішча БССР пры ўмовах узрастаючай ваеннай небясьпекі патрабуе асаблівай пільнасьці, найлепшай выразнасьці ў рабоце, абавязковага спалучэньня штодзённай практычнай работы з задачамі ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны і максымальнай садзейнасьці Чырвонай арміі ў далейшым павышэньні яе баявой магутнасьці.

Камсамол са сваіх радоў, усёй рабочай і працоўнай моладзі павінен выхоўваць рэзэрвы для нашай РСЧА, стойкіх, добра ўладаючых вайсковай тэхнікай байцоў. Ваяізацыя працоўнай моладзі, барацьба за аўладаньне вайсковай тэхнікай павінна займаць адно з важнейшых месц ва ўсёй сыстэме работы камсамолу Беларусі.

У выкананьні ўсіх гэтых задач камсамол Беларусі, працуючы пад кіраўніцтвам КП(б)Б, павінен узьняць і ўзьняце свой удзел на больш высокую ступень.

Узьняць тэмпы падрыхтоўкі да сяўбы ў аднаасобным сэктары

АДОЗВУ КРЫЧАЎСКІХ КАЛГАСЬНІКАЎ АБМЕРКАВАЦЬ У КОЖНЫМ КАЛГАСЕ, У КОЖНАЙ ВЁСЦЫ

Дабіцца права рапартаваць аб поўнай гатоўнасьці да сяўбы

ГОМЕЛЬ. (Наш кар). Ссылка насенных фондаў і падрыхтоўка да веснавой сяўбы па большасьці калгасаў і сельсаветаў рабіцца адзіным з паказальнікаў вялізарнейшага ўплыву партыі на рабочыя і працоўныя масы, усё ўзрастаючай іх актыўнасьці ў барацьбе за набудову сацыялістычнага грамадзтва. У сувязі з такім ростам пашыраюцца маштабы работы камсамолу і разам з тым прад'яўляюцца да яго большыя патрабаваньні. Перш за ўсё патрабуецца ўзмоцненая выхаваўчая работа.

Замацаваць рост новага папаўненьня камсамолу, г. зн. шырока разгарнуць работу па марксыцка-ленінскім выхаваньні новага папаўненьня **«ў духу гераічных традыцый бальшавізму, узьняць яго ідэйна-палітычны ўзровень, выхаваць яго ў духу разуменьня інтэрнацыянальных задач, якія стаяць перад пралетарыятам СССР, уцягнуць яго ў штодзённую работу камсамолу, выхаваць у ім стойкасьць і ініцыятыву ў барацьбе за вырашэньне сацыялістычных задач»** (Постышаў). У гэтым цэнтральная задача ўнутрысаюзнай работы. Побач з гэтым неабходна перадавых камсамольцаў больш рашуча ўцягваць у рады партыі, бо павялічэньне парт'яцра ў камсамоле зьяўляецца важнейшай умовай узмацненьня партыйнага кіраўніцтва яго работай.

Работа па бальшавіцкім выхаваньні новых кадраў камсамолу павінна спалучацца са штодзённай практыкай, са штодзённай барацьбой за ажыцьцяўленьне тістарычных пастаноў XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі аб набудове ў кашцы другой пяцігодкі бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва. Гэта патрабуе ад камсамолу рашуча выкрываць усякія спробы пранікнуць праваапартуністычныя тэорыі аб «плаўным ходзе», спробы сьцьвярджаць, што ў другой пяцігодцы клясавая барацьба будзе аслабляцца, тады, як партыя ўказала, што і ў другой пяцігодцы клясавая барацьба будзе абвастрацца ў асобных раёнах і ў паасобных пэрыяты. У камсамоле троба выкрываць апартуністычную недаацэнку неабходнасьці ўмацаваньня дыктатуры пралетарыяту.

Кампанія па абмене камсамольскіх білетаў, якая зараз праводзіцца, павінна быць у максымальнай меры выкарыстана для хутчэйшай ліквідацыі тых недахопаў, якія ёсьць у рабоце арганізацый ЛКСМБ, для бальшавіцкай мабілізацыі камсамольскіх мас на выкананьне пастановы ЦК УсеЛКСМ і пленуму ЦК ЛКСМБ аб далейшых задачах работы камсамольскай арганізацыі Беларусі.

Партыйныя і камсамольскія арганізацыі павінны па-бальшавіцку забясьпечыць правядзеньне гэтага важнейшага палітычнага мерапрыемства, цалкам падпарадкаваць кампанію па абмене білетаў задачам павышэньня тэмпаў і якасьці работы камсамолу на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, не дапускаючы ператварэньня гэтай кампаніі ў чыстку камсамолу, а таксама ў простае тэхнічнае мерапрыемства.

Прымежнае становішча БССР пры ўмовах узрастаючай ваеннай небясьпекі патрабуе асаблівай пільнасьці, найлепшай выразнасьці ў рабоце, абавязковага спалучэньня штодзённай практычнай работы з задачамі ўзмацненьня абароназдольнасьці краіны і максымальнай садзейнасьці Чырвонай арміі ў далейшым павышэньні яе баявой магутнасьці.

Камсамол са сваіх радоў, усёй рабочай і працоўнай моладзі павінен выхоўваць рэзэрвы для нашай РСЧА, стойкіх, добра ўладаючых вайсковай тэхнікай байцоў. Ваяізацыя працоўнай моладзі, барацьба за аўладаньне вайсковай тэхнікай павінна займаць адно з важнейшых месц ва ўсёй сыстэме работы камсамолу Беларусі.

У выкананьні ўсіх гэтых задач камсамол Беларусі, працуючы пад кіраўніцтвам КП(б)Б, павінен узьняць і ўзьняце свой удзел на больш высокую ступень.

У сваёй пастанове бюро Гомельскага гаркому КП(б)Б абвяшчала «пад адказнасьць упаўнаважаных ГК КП(б)Б, сакратароў ячэек і старшынь сельсаветаў дабіцца за час пяцідзьнёвіка права рапартаваць органу ЦК КП(б)Б — «Зьвязьдзе» да 1-га красавіка аб поўнай баявой гатоўнасьці кожнага калгасу і сельсавету да веснавой сяўбы».

Гэта пастанова абавязвае партыйныя, савецкія і калгасныя арганізацыі ў бліжэйшыя дні дабіцца крутога пералому ў справе ссылкі насенных фондаў, асабліва па бульбе і травах, падрыхтоўкі інвэнтару, вывазкі гною і г. д.

Бульба, якое не хапае ў колькасьці 15.300 цэнт. на аснове мабілізацыі нутраных рэсурсаў, на аснове ўнутрыкалгаснай і міжкалгаснай дапамогі павінна быць вышукана.

Патрэбна адзначыць, што бульба лёчка можа быць пазычана па аблігацыях насеннай пазыкі калгасьнікаў і аднаасобнікаў, у якіх бульба ёсьць, але амаль ніякай работы сярод іх не вядзецца.

З 5.000 аблігацый насеннай пазыкі, якая была выпушчана «Палескай праўдай», рэалізавана 3.000, перавялена сярод калгасьнікаў. Па рэалізаваных аблігацыях сабрана 65.000 кілёграм насеньня розных культур. Але работа па рэалізацыі пазыкі ў разе месц і ў асаблівасьці сярод індывідуальнага сэктару яшчэ зусім слаба распаўсюджана.

Шляхам шырокай растлумачальнай работы сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў, шляхам распаўсюджаньня на аснове добраахвотнасьці насеннай пазыкі можна будзе дадаткова мабілізаваць вялікую колькасьць насеньня.

Н. ГАФТ.

Забясьпечыць засеў тэхнічных культур

КРУПКІ. На 20 сакавіка па калгасах раёну ссылана 72.860 цэнт. насеньня, што складае 55,5 проц. патрэбнага для засеву яравога кліну. Плян засыпкі насеньня ільну выкананы на 15,12 проц., па каноплях—на 27,9 процантаў.

Раённыя арганізацыі яшчэ не ўзначалілі барацьбу за насеньне тэхнічных культур.

Паасобныя сельсаветы праяўляюць яўна апартуністычную бязьдзейнасьць у зборы насеньня. Напрыклад, Нацкі сельсавет ссылаў толькі 30 проц. патрэбнага насеньня.

Шыжкаўскі сельсавет ссылаў збожжавых 35 проц. і ільну 2 проц.

Ёсьць сельсаветы, якія поўнасьцю ссылалі насеньне збожжавых культур, але значна адстаюць па тэхнічных.

Халыкавіцкі сельсавет сабраў насеньне збожжавых культур на 100 проц., бульбы—99 проц., а тэхнічных—усяго толькі 21 проц. Такое самае становішча і па Ўзнацкім сельсавеце, які ссылаў аўса 92 проц., ячменю—134 проц. і бульбы — 96 проц. Плян-жа ссылкі ільну і канапель выкананы на 10 проц.

Усе гэтыя лічбы гавораць, што справа са стварэньнем насенфондаў у Крычэскім раёне знаходзіцца ў пачаткавым становішчы. Калі раённыя арганізацыі не пераключацца на баявыя тэмпы ў галіне збору насеньня тэхнічных культур, дык плошча ў 8 тысяч гэкт. поўнасьцю ня будзе забясьпечана насеньнем.

МАРОЗ.

Рамонт трактараў у койданаўскай МТС

166 цэнт. у фонд міжраённай узаемадапамогі

ВІЦЕБСК. (Па тэлеграфу).

Калгасы Машканскага і Шумнянскага сельсаветаў, арганізаваўшы чырвоныя абозы, здалі ў міжраённы фонд насеннай узаемадапамогі 46 цэнтн. насеньня ільну. Усяго калгасы Віцебшчыны здалі ў міжраённы фонд 166 цэнтн.

Насенная пазыка--лепшы сродак для папаўненьня насенных фондаў

ПОЛАЦАК. (Наш кар.). Абвешчаны пяцідзьнёвік рэалізацыі аблігацый насеннай пазыкі па раёне праходзіць пры актыўным удзеле калгасьнікаў і беднякоў і сераднякоў — аднаасобнікаў.

Калгасьнікі калгасу **імя МОПР'у,** Ветрынскага сельсавету, Папцырын Сяргей, Глінскі Якуб, Столмах Сяргей і Лапіцкі пазычылі калгасу 45 кгр. насеньня розных культур. Апрача гэтага яны абавязаліся рэалізаваць аблігацыі насеннай пазыкі сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў.

Калгасьнікі калгасу **«Ленінскі шлях»,** Юравіцкага сельсавету, Ткачоў Рыгор пазычыў свайму калгасу 200 кгр. бульбы, 20 кгр. ільнасемя; Крывашэйкаў Хведар—80 кгр. бульбы, 8 кгр. ільнасемя, 2 кгр. цыбулі і абавязаўся рэалізаваць 10 аблігацый; Кірэйчанка М. пазычыў 80 кгр. бульбы і абавязаўся рэалізаваць 10 аблігацый; Кукушкін Язэп—50 кгр. бульбы, 8 кгр. ільнасемя, 4 кгр. цыбулі і абавязаўся рэалізаваць 10 аблігацый; Ворочаў А. —80 кгр. бульбы. Усяго па калгасе сабрана 1.045 кгр. рознага насеньня.

У выніку насеннай пазыкі насенфонды на сёньняшні дзень у гэтых калгасах ссыланы поўнасьцю.

Анат. Ш.

Даць адпор растратчыкам насенных фондаў

КОЙДАНАВА. (Ад нашага спэкора). Справа пачынаецца са зьмяшэньня плянаў пасеўнай плошчы.

— Нам даслалі такія планы, што зямлі не хапае,—скарджацца т. **Пулько** —старшыня калгасу **«Ленінскі шлях».**

Калі мала зямлі, то прыгаяй плян пад свой густ — нарапыці праўленцы. Ну і рэзанулі: бульбы трэба 165 —зрэзалі да 80 гэктараў, аўса—308, зрэзалі да 156, тэхнічных — 61, зрэзалі да 17 га.

Але, аднак, не да ўсіх культур у калгасе такая нянавісьць. Напрыклад, вось мне грочку, яна павялічана тут у два разы — замест 16 яе ўхвалілі пасеяць 32 га. Тэндэнцыя поўная—замяніць плян засеву высокакаштоўных культур грочкай. Гэты факт лепш за ўсё сьведчыць аб неўгрунтаванасьці спасыланьняў на адсутнасьць зямельнай плошчы.

Сьледам за зьмяшэньнем пляну пасеўнай плошчы «аб'ектыўна» зрываецца ссылка насенных фондаў. Возьмем любую культуру і ў графе «недахват» вы знойдзеце поўную лічбу недахвату насеньня. Напрыклад, бульбы не хапае 32 тоны, аўса—6 тон і г. д.

Куды-ж дзелася насеньне? Запісы ў рахункавых кнігах даюць на гэта поўны адказ.

У калгасе 145 гаспадараў і амаль кожная мае перабор прадуктаў. Начыпрыклад, калгасьнік Ацапкевіч Я., якому пры разьмеркаваньні выдзялілі 5 пудоў пшаніцы, атрымаў 120 пудоў.

«Давалі колькі каму троба», — паіўна заяўляе рахункавод калгасу.

Той, хто думае, што перабор ёсьць вынік малога даходу калгасьніка,— памыляецца. У «Ленінскім шляху» па адзін працадзень атрымлівалі 2 кілёграмы збожжавых культур. Гэты даход вышэй сярэдняга па Беларусі, які можа з лёгкам забясьпечыць калгасьніка збожжавымі культурамі.

Але канстатаваць факт — мала, ад гэтага насеньня ня прыбудзе, а насеньне павінна быць, — так парашылі калгасьнікі калгасу «Ленінскі шлях» і прынялі пастанову аб упясеньні назад перабору і лішняга насеньня ў калгас для насеннага фонду.

Для рэалізацыі аблігацый насеннай пазыкі вылучылі 3 брыгады з лепшых калгасьнікаў.

Калгасьнікі сталі на правільны шлях, але гэта яшчэ не гарантуе перамогі. Задача калгасу — па-бальшавіку даць адпор зрыўшчыкам насеннага фонду кулаку і яго агентам — апартуністу, гультаю, рвачу. Толькі ў бязьлітаснай барацьбе будзе забяспечана перамога.

Японцы бязупынна ўмацоўваюць пазыцыі

Пяць пасяджэньняў „мірнай канфэрэнцыі" скончыліся безрэзультатна

У Люхэ прыбылі 4 транспарты новых войск

ШАНХАЙ, 27. Адбылося ўжо 5 пасяджэньняў «мірнай канфэрэнцыі». Мяркуючы па некаторых фактах, якія сталі здабыткам грамадзкасьці, **не дасягнута амаль ніякіх рэзультатаў.** Ёсьць таксама другія пункты разгалосьсяў, паводле якіх бакі ня ідуць па ўступкі. Аднак, ніякіх пэўных вестак адносна гэтага няма. Высьвятляецца, што адзіным «дасягненьнем» канфэрэнцыі зьяўляецца пазначэньне японскай ваеннай камісіі з удзелам ваенных экспэртаў дзяржаў для распрацоўкі дэталяў па наглядзе за эвакуацыяй, аб якой, да рэчы кажучы, дагаворанасьці няма.

Побач з гэтымі перагаворамі японцы і кітайцы робяць далейшыя шырокія ваенныя падрыхтаваньні. **Японскія войскі нястомна ўмацоўваюць пазыцыі і іменна ў тых мясцох, з якіх, згодна папярэдняй згоды, японскія войскі павінны звакуявацца.** Гавораць аб вялікай колькасьці зноў прыбыўшых кітайскіх войск, якія занялі раён паміж Сучжоу і Нанкінам і ўмацоўваюць пазыцыі ў чаканьні адпаўленьня ваенных апэрацый з боку японцаў. Апошнія, паводле меркаваньняў, пачнуцца ў той час, калі камісія Лігі нацый выедзе ў Манчжурыю.

Кітайскія афіцыяльныя крыніцы сьцьвярджаюць, што пасьля адводу войск у японцаў застануцца наступныя сілы: **20 тысяч войск 14-й дывізіі,** якая знаходзіцца на першай лініі, **18 тысяч войск у тыле,** тэхнічныя часьці колькасьцю **ў 10 тысяч чалавек, 6 тысяч морскай пяхоты і 9 тысяч іншых войск.** Згодна кітайскіх справаздач, **учора ў Люхэ прыбылі 4 транспарты японскіх войск. Транспарты высадзілі тысячу салдат.** У Люхэ знаходзіцца галоўны штаб японскіх узброеных сіл у Шанхаі. Учора на працягу гадзіны адбывалася перастрэлка паміж кітайскімі і японскімі атрадамі ў Сучжоу недалёка ад Лёдзяна (ТАСС).

Канцэнтрацыя японскага флёту ў Ханькоу

ШАНХАЙ, 27. Адпачасова з прыездам Сіазавы (камандуючы японскім флётам у кітайскіх водах) **у Ханькоу адбываецца канцэнтрацыя японскіх ваенных суднаў.** Зараз у Ханькоу 13 японскіх ваенных суднаў.

Перагаворы аб адводзе японскіх войск не далі вынікаў

ТОКІЕ, 27. «Ніцы Ніцы» паведамляе з Шанхаю, што перагаворы паміж японскімі і кітайскімі ваеннымі дэлегатамі ў падкамісіі па пытаньні аб дэталях адводу японскіх войск не далі вынікаў.

Паветраная атака Сучжоу

ШАНХАЙ, 27. Паведамляюць, што учора зроблена яшчэ адна паветраная атака на Сучжоу, у якой прымалі ўдзел два японскія самалёты. **Самалёты скінулі лёгкія бомбы, якія ня выбухнулі, і адкрылі кулямётны агонь.**

Караюць за належнасьць да антыяпонскай арганізацыі

ШАНХАЙ, 27. Паведамляюць, што паводле загаду камандаваньня 19-й арміі ў Руйшане **пакарана 6 членаў салдацкай антыяпонскай арганізацыі.**

Буржуазная прэса Зэўропы «асьвятляе» падзеі ў Кітаі.

Адкрыўся другі зьезд працоўных літоўцаў ЕССР

Учора ў вялікай залі інтэрнацыянальнага клюбу адкрыўся **2-гі зьезд працоўных літоўцаў** Савецкай Беларусі. На зьезьдзе прысутнічае 60 дэлегатаў — прадстаўнікоў 7 тысяч рабочых, калгасьнікаў і сялян-аднаасобнікаў-літоўцаў. На зьезьдзе прымаюць удзел прадстаўнікі літоўскай грамадзкасьці Масквы, Ленінграду, Харкава і іншых гарадоў Савецкага Саюзу.

Адкрываючы зьезд, сакратар ЦВК тав. **Гнілякевіч** падрабязна спыніўся на вялізарных посьпехах, якіх дасягнула рабочая кляса і працоўнае сялянства БССР пад кіраўніцтвам КП(б)Б у сацыялістычным будаўніцтве, у будаўніцтве нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьместе культуры.

Працоўныя літоўцы БССР разам з усёй рабочай клясай і працоўным сялянствам актыўна змагаюцца за выкананьне плянаў чацьвертага, заключнага году пяцігодкі і рыхтуюць бальшавіцкую сустрэчу другой пяцігодцы, пяцігодцы ліквідацыі клясаў і набудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Зьезд выбраў прэзыдыум у складзе 18 асоб. У прэзыдыум выбраны т. т. **Гнілякевіч, Амбражунас, Кльс, Матулайціс, Бучукас** і прадстаўнікі нацыянальных калгасаў і сельсаветаў.

Зьездам выбран гаматовы прэзыдыум у складзе **палітбюро ЦК УсеКП(б), старшыні ЦКК УсеКП(б) тав. Рудзутака, т. Тэльмана, Ленскага, Фостара, Корчыка і бюро ЦК КП(б)Б.**

На першым пасяджэньні зьезд заслухаў даклад тав. **Гнілякевіча** аб міжнародным і ўнутраным становішчы СССР.

Зьезд, апрача дакладу тав. Гнілякевіча, разглядзіць пытаньні **аб калгасным будаўніцтве і падрыхтоўцы да веснавой сяўбы і аб чарговых задачах культурнага будаўніцтва.**

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

АБМЕН КАМСАМОЛЬСКІХ БІЛЕТАЎ—

ПАДПАРАДКАВАЦЬ ЗАДАЧАМ ПАВЫШЭНЬНЯ РОЛІ ЯЧЭЙКІ ЛКСМБ НА ГАСПАДАРЧЫМ І КУЛЬТУРНЫМ ФРОНЦЕ

Забясьпечыць канкрэтную дапамогу

Камсамольская арганізацыя Беларусі ўступіла ў палосу правядзеньня важнейшай палітычнай кампаніі — абмену камсамольскіх білетаў. Падрыхтоўчая работа і сам ход абмену білетаў у раёнах першай чаргі (прымежныя і Віцебскі) паказваюць, што ў тых раённых арганізацыях і ячэйках ЛКСМБ, дзе правільна ўсьвядомлена значэньне і задачы гэтай кампаніі, дзе шырока разгорнута падрыхтоўчая работа пры актыўнейшым удзеле і дапамозе мясцовых партыйных арганізацый, там абмен білета суправаджаецца ростам палітычнай актыўнасьці і творчага энтузіязму, павышэньнем ролі ячэек ЛКСМБ на вытворчасьці, у калгаснай вёсцы і культурным фронце.

Кампанія па абмену білетаў у радзе ячэек ЛКСМБ на вытворчасьці адзначаецца павышэньнем тэмпаў работы, узяцьцем камсамольцамі раду канкрэтных абавязкаў па рэалізацыі 6 умоў тав. Сталіна, па арганізацыі гаспадарча-разрахунковых брыгад, аўладаньні тэхнікай і г. д. У вёсцы многія ячэйкі ЛКСМБ значна ўзмацнілі сваю работу ў справе вырашэньня канкрэтных задач арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, у справе барацьбы за аўладаньне вышынямі трэцяй бальшавіцкай вясны. Гэта работа праходзіць па лініі актыўнага ўдзелу ў арганізацыі вытворчых брыгад у калгасах, збору і захыстцы насеньня, рамонту інвэнтару і раду іншых мерапрыемстваў.

Аднак, трэба рашуча падкрэсьліць, што кампанія абмену камсамольскіх білетаў далёка не ва ўсіх ячэй арганізацыях узьнята на вышыню палітычных задач. Фактам, які пацьвярджае такое становішча, зьяўляецца пастанова бюро ЦК ЛКСМБ па дакладах Койданаўскага, Заслаўскага, Асіпавіцкага райкомаў камсамолу. У гэтых раёнах абмен білетаў праходзіць без належнай увагі з задачамі ліквідацыі тых недахопаў у рабоце, якія дапушчаны пры былым кіраўніцтве ЛКСМБ без належнай увагі з барацьбой за павышэньне ролі ячэйкі ЛКСМБ на гаспаларчым і культурным фронце. У радзе выпадкаў дапушчаны скажэньні дырэктыў па абмену білетаў, якія характарызуюцца зьвядзеньнем абмену да простага тэхнічнага мерапрыемства, з аднаго боку, або ператварэньне абмену білетаў у чыстку камсамольскай арганізацыі.

У практыцы партыйных камітэтаў Койданаўскага, Заслаўскага, Капыльскага і інш. раёнаў спачатку разгортваньня кампаніі мелі месца элементы фармальных адносін, ня была завострана ўвага парт'ячэек на неабходнасьць актыўнейшай салідэйнасьці камсамолу ў правядзеньні абмену білетаў. Некаторыя парт'ячэйкі нават не абмяркоўвалі ў сябе гэтага пытаньня і застаюцца зусім у баку ад кампаніі па абмену камсамольскіх білетаў, абмежаваўшыся ў радзе выпадкаў толькі вылучэньнем упаўнаважаных.

Знамянальныя па сваёй вур'ёзнасьці факты неразуменьня значэньня палітычнай важнасьці кампаніі абмену камсамольскіх білетаў мелі месца ў парт'ячэйцы Менбудтресту. У часе абгаварэньня пытаньня аб удзеле парт'ячэйкі ў гэтай кампаніі пасобныя партыйцы выказваліся супроць гэтага, ставячы знак роўнасьці значэньня абмену камсамольскіх білетаў з абменам... казначэйскіх кніжак.

Няправільнае разуменьне абмену білетаў, як тэхнічнага мерапрыемства, характэрна для цэлага раду парт'ячэек і пасобных райкомаў партыі. Гэтым у значнай меры тлумачыцца тое, што абмен камсамольскіх білетаў у радзе месц праходзіць бясьсьледна, толькі як тэхнічнае мерапрыемства, або ператвараецца ў чыстку.

Такія грубейшыя скажэньні дырэктыў аб абмене камсамольскіх білетаў павінны пераскакцца ў корані. Зразумела, што праводзіць чыстку ЛКСМБ у парадку кампаніі, абсалютна няма ніякай патрэбы.

Для забесьпячэньня камсамолу пасьляховага правядзеньня кампаніі па абмену білетаў, падпараджаванай павышэньню ролі ячэек ЛКСМБ і іх баяздольнасьці ў барацьбе за вырашэньне чарговых задач сацыялістычнага будаўніцтва — неабходна актыўнейшая дапамога з боку партарганізацыі, рашучая барацьба з недаацэнкай і фармальнымі адносінамі да гэтай важнейшай справы.

Не прыніжаць палітычнага значэньня

З пастановы бюро ЦК ЛКСМБ ад 17 сакавіка па дакладах Койданаўскага, Заслаўскага, Асіпов'цкага РК і калектыву ЛКСМБ фабрыкі „Кастрычнік" (Менск) аб ходзе абмену камсамольскіх білетаў

Заслухоўшы паведамленьне аб ходзе работы і мерапрыемствах райкомаў камсамолу ў сувязі з абменам білетаў, бюро ЦК канстатуе:

а) Кіраўніцтва адзначаных райкомаў да апошняга часу не забясьпечыла і не разгарнула належным чынам работы па рэалізацыі рашэньняў ЦК УсеЛКСМ у сувязі з абменам камсамольскіх білетаў. Ячэйкі камсамолу не забясьпечаны ўпаўнаважанымі. РК КСМ не змаглі паведаміць бюро ЦК аб працэсах, якія адбываюцца ў ячэйках у сувязі з абменам.

б) Арганізацыі не забясьпечылі ўвязку кампаніі мабілізацыі мас камсамольцаў па канкрэтнае выкананьне важнейшых гаспадарча-палітычных задач. Большасьць абавязкаў РК і ячэек носіць агульны характар. Вакол абмену білетаў РК і ячэйкі не разгарнулі патрэбнай растлумачальнай работы. Бальшавіцкая работа ў гэтым напрамку павінна была стварыць круты пералом у перабудове саюзнага кіраўніцтва ў рабоце ячэек, спрыяць большай мабілізацыі камсамольцаў на выкананьне прамфінпляну, пасьпяховае правядзеньне сяўбы і арг-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў.

в) Памылкі ЦЧО не скарыстаны кіраўніцтвам адзначаных РК.

Кіраўніцтва па здолела своечасова пакіраваць тэндэнцыі ператварэньня абмену ў чыстку, не зразумела таго, што ад іх натрабавалася апэрацыйнае штодзеннае кіраўніцтва, паказ і канкрэтная дапамога ў арганізацыі тэхнікі абмену, давядзеньне рашэньняў ЦК УсеЛКСМ да кожнага камсамольца, маладога рабочага і калгасьніка.

У выніку ўсяго гэтага ў адзначаных арганізацыях кампанія абмену камсамольскіх білетаў у асноўным ператворана ў простае тэхнічнае мерапрыемства і не падпарадкавана гаспадарча-палітычным задачам.

Бюро ЦК абавязвае ўсе райкомы прыняць усе рашучыя канкрэтныя захады, якія-б забясьпечылі неадкладнае зьнішчэньне скажэньняў, недахопаў якія высьветлены ЦК ЛКСМБ у адзначаных раёнах і патрабуе ад усіх арганізацый недапушчэньня падобнага роду зьявішчаў у практыцы кіраўніцтва і далейшай рабоце па абмене.

ЦК ЛКСМБ ПРАПАНУЕ:

1. Важнейшай задачай камсамольскіх арганізацый у правядзеньні абмену білетаў зьяўляецца неадкладнае апэрацыйнае выкананьне рашэньняў V пленуму ЦК ЛКСМБ і бюро ЦК УсеЛКСМ аб становішчы беларускай арганізацыі, што павінна спрыяць яшчэ большаму павышэньню актыўнасьці мас камсамольцаў у выкананьні прамфінпляну, арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў, ахопу камсамольцаў марксыцка-ленінскай вучобай, умацаваньню бальшавіцкай дысцыпліны ў радах арганізацыі, павысіць ролю і ўдзельную вагу камсамолу на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва, узмацніць клясавую баяздольнасьць і пільнасьць арганізацыі.

2. Абавязаць усе РК у 2-хдзенны тэрмін давесьці рашэньні V пленуму ЦК ЛКСМБ, дырэктывы ЦК УсеЛКСМ, прамову тав. Косарава і артыкул тав. Андрэева і гэтыя рашэньні да кожнай ячэйкі і камсамольца. Забясьпечыць жывую дапамогу з боку РК усім ячэйкам, арганізаваўшы растлумачэньне тэхнікі і чаргі абмену камсамольскіх білетаў такім чынам, каб кожны камсамолец, малады рабочы і калгасьнік быў знаёмы з тэхнікай, ведаў час і чаргу абмену.

3. Растлумачыць РК, ячэйкам і кожнаму камсамольцу, што абавязацельствы, якія прымаюцца пры абмене, павінны быць канкрэтныя і падпарадкаваны задачам выкананьня гаспадарчых плянаў, выходзячы з умоў кожнага заводу, прадпрыемства, калгасу і ўстановы.

РК і ячэйкам арганізаваць штодзенны кантроль за выкананьнем прынятых абавязкаў у працэсе падрыхтоўкі да абмену білетаў, паладзіўшы спаборніцтва паміж ячэйкамі і пасобнымі камсамольцамі на лепшае і хутчэйшае іх выкананьне.

4. Абавязаць РК у 3-хдзенны тэрмін мабілізаваць увесь раённы камсамольскі актыў для работы ў ячэйках па абмене і па веснавой сяўбе.

5. ГК і РК другое і трэцяе чаргі ў трохдзенны тэрмін зацьвердзіць склад троек па абмене білетаў пад старшынствам сакратароў РК КСМ з абавязковым уключэньнем кіруючых партыйных работнікаў і членаў прэзыдыуму РКК.

Аналёгічныя тройкі ў пяцідзенны тэрмін арганізаваць і зацьвердзіць ва ўсіх ячэйках камсамолу.

Папярэдзіць усе арганізацыі, што да раённага кіраўніцтва, якое не забясьпечыць выкананьне дырэктыў ЦК аб складзе троек, ЦК ЛКСМБ у кожным пасобным выпадку прымае суровыя арганізацыйныя захады.

6. Прапанаваць культпропу ЦК і ўсім РК распрацаваць мерапрыемствы, якія-б забясьпечылі палепшэньне пастаноўкі марксыцка-ленінскай вучобы асабліва сярод навічкоў.

7. Прапанаваць усім рэдакцыям камсамольскіх газэт, старопак, шматтыражак, узмацніць асьвятленьне і паказ вопыту работы камсамольскіх ячэек і райарганізацый па абмене.

РК прыняць рашучыя захады да ўзмацненьня работы па перадачы лепшых камсамольцаў, рабочых і ўдарнікаў-калгасьнікаў у партыю.

У дапамогу падшэфнаму калгасу

У сувязі з абменам камсамольскіх білетаў ячэйка ЛКСМБ Віцебскага рабфаку сувязі ўзяла на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў па арганізацыі працы ў падшэфным калгасе «Новы сьвет».

Узятыя камсамольцамі абавязацельствы ажыцьцяўляюцца пасьпяхова. На ініцыятыве камсамольцаў у калгасе арганізован агратэхнічны гурток, у якім рэгулярна адбываюцца заняткі.

Створаны брыгады па засыпцы насенных фондаў. Кожны выходны дзень камсамольцы рабфаку арганізоўваюць суботнікі па вывазцы гною.

Зараз ячэйка рыхтуецца да правядзеньня селькораўскага рэйду па пытаньні аб гатоўнасьці калгасу да веснавой сяўбы.

А. М.

Канкрэтнымі абавязкамі

У сувязі з падрыхтоўкай да абмену камсамольскіх білетаў, Барысаўскі райком камсамолу вызначыў канкрэтныя мерапрыемствы па ахопе 1.000 камсамольцаў - калгасьнікаў агратэхнічнай вучобай.

Ячэйка заводу «Пралетарскі молат» узяла на сябе абавязак датэрмінова выканаць заказ 10 фрэзэрных барабанаў для торфабалот. Ячэйка калгасу «Рой» арганізавала тры брыгады па ачыстцы насеньня, рамонце інвэнтару і падрыхтоўцы цягавай сілы і зброі. Сіламі камсамольцаў поўнасьцю окончана ачыстка насеньня ў калгасе «Новае жыцьцё».

Выправіць памылкі

Асобныя камсамольскія ячэйкі (Лёзьнянскі раён) паказваюць узорныя прыклады работы па ўвязцы кампаніі абмену білетаў з павышэньнем удзелу ў вырашэньні практычных гаспадарча-палітычных задач. Ячэйка калгасу «Авангард», разгарнула вялікую работу па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. У калгасе засыпана і ачышчана насеньне, ліквідавана абязьлічка, адрамантаваны сельска-гаспадарчы інвэнтар і г. д. Пры актыўным удзеле камсамольскай ячэйкі калгас поўнасьцю падрыхтаваны да сяўбы.

Ячэйка ЛКСМБ пры калгасе «Полымя», Добрамысьленскага сельсавету, вылучыла 8 брыгад на дапамогу суседнім калгасам па стварэньні вытворчых брыгад і вытворча-фінансавых плянаў.

Лёзьнянская ячэйка ЛКСМБ прыняла актыўны ўдзел у мабілізацыі сродкаў, у выніку чаго квартальны плян па мабілізацыі сродкаў у Лёзьне выкананы на 120 проц.

Побач з гэтым пасобныя камсамольскія ячэйкі (Сутоцкага, Старабабыльскага, Крынкаўскага і Касьцюўскага сельсаветаў) слаба рыхтуюцца да абмену камсамольскіх білетаў. Слаба яшчэ камсамолія Лёзьняншчыны змагаецца за павышэньне ўраджаю, за аўладаньне агратэхнікай.

Папярэдняя праверка ходу кампаніі па абмене камсамольскіх білетаў паказала, што ў радзе ячэек дапушчаны скажэньні дырэктыў ЦК ЛКСМБ. Напрыклад, ячэйка ЛКСМБ пры беларускай ШКМ з 30 камсамольцаў выключыла 12.

А. М.

ПАСТАНОВУ ЦК АД 26 САКАВІКА—У КАЛГАСНЫЯ МАСЫ

Учора апублікавана пастанова ЦК УсеКП(б) ад 26 сакавіка з поваду пры мусовага аграмаджаньня жывёлы. За апошнія два гады ў пастановах ЦК партыі, у выступленьнях тав. Сталіна, у пастановах XVI партыйнага зьезду і XVII партканфэрэнцыі ня раз падкрэсьлівалася, што асноўнай, цэнтральнай задачай у галіне калгаснага будаўніцтва на даным этапе зьяўляецца разьвіцьцё і ўмацаваньне арцельнай формы калгасаў.

Ужо ў самы апошні час у пастанове ад 4 лютага г. г. ЦК з асаблівай сілай падкрэсьліў, што арцельная форма калгасаў яшчэ не разгорнута выстарчальна і не замацавана. ЦК зноў і зноў перасьцерагаў партыйныя арганізацыі, што «спробы штучнага паскарэньня пераходу ад арцельнай формы калгасаў да камуны на цяперашняй стадыі разьвіцьця калгасаў зьяўляюцца сур'ёзнай небясьпекай». І ўсё-ж такі знайшліся некаторыя арганізацыі і пасобныя работнікі, якія прайшлі міма гэтых указаньняў і перасьцярог, як аб гэтым ужо паведамлялася ў «Правде». У прыватнасьці, некаторыя работнікі Парочніцкага раёну, Сярэдняй Волгі, парапылі, што «с.-г. арцель — гэта ўжо пройдзены этап». Знайшліся разам з тым і такія парт-арганізацыі, якія не далі своячасовага і рашучага адпору гэтым «лявацкім» тэндэнцыям. Цэнтральны Камітэт на раз папярэджваў партыйныя арганізацыі наконт абсалютнай недапушчальнасьці парушэньняў у калгасным будаўніцтве, у прыватнасьці, наконт недапушчальных парушэньняў статуту с.-г. арцелі. І ўсё-такі знайшліся некаторыя арганізацыі і некаторыя работнікі, якія прайшлі міма гэтага папярэджаньня і падышлі да задачы калгаснага будаўніцтва ня так, як будаўнікі, а як адміністратары.

Партыя, вырашаючы ў асноўным збожжавую праблему, паставіла разьвіцьцё жывёлагадоўлі, як цэнтральную на даным этапе задачу. І вось знайшліся людзі, якія парашылі, што з гэтай справай можна справіцца проста, «раз у раз»: варта, моў, толькі поўнасьцю аграмадзіць кароў і дробную жывёлу, якая ёсьць у калгасьніках. Пры гэтым асаблівай увагі заслугоўвае той факт, што калі супроць гэтых спроб у некаторых раёнах і высоўваліся пярэчаньні, дык звычайна гэтыя пярэчаньні зводзіліся да ўказаньня на непадрыхтаванасьць матар'яльна - тэхнічнай базы для хуткага аграмаджаньня жывёлы і толькі. Няма, моў, скотных двароў, няма кармоў, а таму давайце пакуль з аграмаджаньнем пачакаем.

Тлумачэньне гэта важкае і само па сабе правільнае. Але яно мае адзін істотны недахоп. Дапусьцім, што даная арцель мае і памяшканьні для жывёлы і неабходную колькасьць кармоў. Ці вынікае адсюль, што можна прымусова аграмадзіць жывёлу пасобных калгасьнікаў. Ці не зразумела, што людзі, якія думаюць вырашыць жывёлагадоўчую праблему шляхам прымусовага аграмаджаньня жывёлы, якая ёсьць у калгасьнікаў, прытрымліваюцца тэй «палітыкі», якую тав. Сталін у свой час назваў «палітыкай» унцера Прышыбеева. Паміма таго, што за спробамі пераскочыць праз арцель да камуны хаваецца апартуністычнае жаданьне адчапіцца ад цяжкай задачы сацыялістычнага перавыхаваньня калгасьнікаў, абыйсьці яе і адміністрацыйным шляхам вырашыць тыя задачы сацыялістычнай перабудовы вёскі, — гэта справа мае яшчэ і другі бок, — бок эканамічны.

Што азначала б ліквідацыя індывідуальнай часткі гаспадаркі калгасьніка сёньня? Над гэтым, відаць не задумваюцца «заўзятыя» адміністраторы. Тут гэта значыла-б, што калгасы сёньня павінны былі - б быць замест арганізацыі вытворчасьці вырашаць задачу цэнтралізаванага снабжэньня калгасьнікаў, вырашаць задачу задавальненьня патрэб калгасьнікаў. Прышлося - б перавесьці калгасьнікаў на грашовую заработную плату, для чаго патрэбна было-б адарваць мільярды рублёў зваротных сродкаў з іншых галін народнай гаспадаркі, бо калгасы не накапілі яшчэ выстарчальных уласных грашовых сродкаў, выстарчальных натуральных запасаў. Зрыў усяго народна - гаспадарчага плану — вось што было-б вынікам такой «палітыкі». ЦК ня раз і ў сваёй пастанове ад 4 лютага г. г. асабліва падкрэсьліваў супроць спроб перавесьці аплату працы калгасьнікаў на грашовую зарплату. Але якая справа да гэтых перасьцярог «леваком», якім «усё ці па чым». І ня дзіўна, што ў парыве адміністрацыйнага захапленьня яны скачуць пад дудку клясавага ворага, што яны ў радзе выпадкаў становяцца ахвярай адкрытай кулацкай правакацыі.

Задача партыі заключаецца ў далейшым разгортваньні і ўмацаваньні арцельнай формы сельскай гаспадаркі, яна, у прыватнасьці, заключаецца ў тым, «каб у кожнага калгасьніка была свая карова, дробная жывёла, птушка», каб «арганізаваць дапамогу і садзейнасьць калгасьнікам, якія ня маюць каровы, або дробнай жывёлы, у куплі і гадоўлі маладняка для асабістых патрэб». Нарэшце, калі ўяць практыку прымусовага аграмаджаньня жывёлы калгасьнікаў з пункту гледжаньня задач жывёлагадоўлі, дык з гэтага пункту гледжаньня апартуністычная блізарукасьць арганізацый, якія дапускаюць гэту практыку, стане відавочнай.

Партыя дасягнула значных посьпехаў у будаўніцтве калгасных таварных фэрм. Канцэнтрацыя стада на фэрмах дае вялізарны эфэкт у сэнсе выхаду таварнай прадукцыі. Аднак, задача пашырэньня стада прадукцыйнай жывёлы шляхам гадаваньня ўласнага прыплоду калгаснымі фэрмамі зусім яшчэ ня вырашана. Больш таго, тэхнічна і гаспадарча яны яшчэ настолькі слабыя, што ўскласьці толькі на іх гэту задачу было-б памылкова.

Задачу пашырэньня стада і гадоўлі маладняка ў калгасах сёньня нельга вырашыць без актыўнага ўдзелу ў гэтай справе кожнага калгасьніка. Калгасная фэрма або інкубатарная станцыя, прадаючы калгасьнікам частку прыплоду (цялят, парасят, курынт), дапамагаючы ім абзавесьціся сваёй уласнай жывёлай, забясьпечвае гэтым самым вялізарны размах у справе гадаваньня маладняка. Але вось ёсьць, аказваецца, такія «тэарэтыкі», якія сьцьвярджаюць, што гэта можа прынесьці «вялізарную шкоду аграмаджаньню жывёлы распальваньнем дробнаўласьніцкіх настрояў калгасьнікаў, стварэньнем ілюзій, што пры калгасе кожны бядняк і сярэдняк будзе карыстацца асобнай кароўкай» (Сярэдне-волскі журнал «Аграрник-марксист, № 1). Паводле гэтай «тэорыі» выходзіць, што з дробнаўласьніцкімі настроямі калгасьнікаў лёгка пакончыць, аграмадзіўшы жывёлу і ніякай такой спэцыяльнай работы па сацыялістычным перавыхаваньні калгасьнікаў ня будзе патрэбна. Гэта «лявацкая» тэорыя лішні раз сьведчыць аб тым, што ня ўсе яшчэ да канца зразумелі сэнс пастановы ЦК аб арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў у іх арцельнай стадыі разьвіцьця і, у прыватнасьці, не зрабілі тых неабходных вывадаў з указаньняў ЦК аб тым, што арцельная форма калгасаў яшчэ даволі не разгорнута і не замацавана.

Задачай усіх партыйных арганізацый зараз зьяўляецца, па-першае, шырокая папулярызацыя пастановы ЦК ад 26 сакавіка сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў, і па-другое, настойлівае правядзеньне яе ў жыцьцё. У прыватнасьці, улічваючы пачатак пасеўнай кампаніі, партарганізацыі абавязаны дабіцца, каб кожны калгас прадугледзеў такі пасеў кармовых культур, які-б забясьпечваў кармамі ня толькі жывёлу калгасных фэрм, але і жывёлу, якая знаходзіцца ва ўласнасьці калгасьнікаў.

Неабходна «спыніць усякія спробы прымусовага аграмаджаньня кароў і дробнай жывёлы ў калгасьнікаў, а вінаватых у парушэньні дырэктывы ЦК выключаць з партыі». Трэба рашуча пакончыць з «лявацкімі» тэорыямі і «лявацкай» практыкай пераскакваньня праз арцельную форму калгасаў.

Пастанова ЦК адыграе вялізарную ролю ў арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў. Яна паслужыць новым стымулам узьдыму вытворчай актыўнасьці калгасных мас, паскорыць тэмпы вырашэньня жывёлагадоўчай праблемы, яна нанясе зьнішчальны ўдар клясаваму ворагу.

«(Правда»).

Усе прадпрыемствы БССР пераводзяцца на 7-мі гадзінны рабочы дзень

Урадавая камісія пры СНК БССР па падрыхтоўцы правядзеньня 7-мі гадзіннага рабочага дня, вынесла пастанову — перавесьці на 7-мігадзінны дзень усе прамысловыя прадпрыемствы, якія да гэтага часу яшчэ не пераведзены. Камісія прапанавала ўсім наркаматам, гаспадарчым аб'яднаньням, гарсаветам і райвыканкомам неадкладна прыступіць да падрыхтоўкі прадпрыемстваў рэспубліканскай і мясцовай прамысловасьці да пераходу на 7-мі гадзінны рабочы дзень.

Канкрэтныя тэрміны пераходу павінны быць устаноўлены кіраўнікамі прадпрыемстваў з такім разьлікам, каб пераход усіх прамысловых прадпрыемстваў быў скончан не пазьней 1 ліпеня 1932 г.

Гэта пастанова не пашыраецца на прадпрыемствы з сэзоннай вытворчасьцю — будаўніцтва дарожнае, прамысловае, камунальнае і інш., вытворчасьць будматар'ялаў (цэгры, вапны), торфу і лесазагатоўкі, сплаў, прадпрыемствы сельскай гаспадаркі (саўгасы, МТС і інш.), а таксама прадпрыемствы НКШЗ, Наркамводу і іншыя прадпрыемствы саюзнага значэньня, пераход якіх можа быць праведзен толькі з дазволу Урадавай камісіі пры СНК СССР.

Наркамфін СССР пастанавіў прэміяваць „Палескую праўду"

У сваёй пастанове ад 20 сакавіка 1932 г. калегія Наркамфіну СССР адзначыла, што Гомель на працягу другога паўгодзьдзя 1931 г. сыстэматычна перавыконваў план мабілізацыі сродкаў насельніцтва. Выключную ролю ў гэтым адыграла Гомельская газэта «Палеская праўда», якая паданьню мабілізавала масы па вырашэньне пастаўленых задач па выкананьні фінпляну і зьяўлялася ініцыятарам раду арганізацыйна-масавых мерапрыемстваў.

Улічваючы вялікія заслугі Гомельскай газэты «Палеская праўда», калегія Наркамфіну СССР пастанавіла адпусьціць у распараджэньне рэдакцыі газэты 5.000 руб. для прэміяваньня лепшых рабкораў-ударнікаў фінфронту.

Рашуча змагацца з кулацка-месьніцкімі тэндэнцыямі

Цэнтральнай задачай вясковых партарганізацый зьяўляецца барацьба за стварэньне насенных і страхавых фондаў у разьмерах, неабходных для абсемяненьня яравога кліну. Аднак, тэмпы ссыпкі насенных фондаў у Крычаўскім раёне сьведчаць аб тым, што большасьць вясковых партыйных ячэек не пераключылася на выкананьне гэтай цэнтральнай задачы.

Так, за апошнюю дэкаду сакавіка прырост насенных фондаў складае: па бульбе — 8,8 проц., па тэхкультурах і збожжавых ёсьць зьніжэньне. Зараз агульны насенны фонд складае па збожжавых культурах—100 проц., тэхкультурах—62 проц., бульбе—75 проц. Сюды не ўваходзіць нехапаючае насеньне гароднины і кораньплодаў.

У чым асноўная прычына такога ходу збору насеньня. Яна заключаецца ў тым, што мясцовыя савецкія і калгасна - земельныя арганізацыі падмянілі канкрэтную апэрацыйную работу цэлярызмам, штампам, алілуйшчынай і «очковтирательством».

Зямельныя арганізацыі — райза, райкалгассаюз, штампуючы дырэктывы вышэйшых арганізацый, ня толькі не кіравалі работай па стварэньні насенных фондаў, а наадварот сьлепа давяралі нічога негаворачымі, у большасьці выпадкаў выдуманым зводкам з месц.

Цікава адзначыць, што зараз ні адзін з кіраўнікоў работу ня можа адказаць колькі-ж паўнэце ў раёне заасыпана насеннай бульбы.

Улік насеннай бульбы робіцца выключна на «глазок». Прынята лічыць, што ў кожным калгасе 83 цэнтн., а ніхто іх ня зважаў, не правяраў і ня мае дакладнага ўліку. Між тым ёсьць калгасы, дзе ў калгасе зьмяшчаецца звыш 330 цэнтн. бульбы, а яны фігуруюць як 83 цэнтн.

Пасьля праведзеных з 23 лютага па 5 сакавіка пробных высеваў у поле, частка кіраўнікоў калгасаў, а часткова райкалгассаюзу і райза ап'янёная першымі «посьпехамі», зусім аслабіла сваю ўвагу да засыпкі насенных і страхавых фондаў.

У большасьці калгасаў раёну працягваецца злачынае разбазарваньне насенных фондаў. Толькі гэтым і можна тлумачыць зьніжэньне процанту насенных фондаў па тэхкультурах і бульбе.

Загатоўчыя арганізацыі раёну тольки зараз пачынаюць думаць аб загатоўцы завознага насеньня (кукурузы, гароднины і г. д.).

Без канца ляцяць у нізы дырэктывы, трацяцца прошы на розныя непатрэбныя камандыроўкі, а практычных вынікаў работы загатоўчых арганізацый няма.

Вакол засыпкі і загатоўкі насеньня ідзе жорсткая клясавая барацьба. Кулак і яго агэнтура ўсімі сіламі імкнуцца сарваць гэтую важнейшую кампанію. Кулак праводзіць сваю падрыўную работу, як унутры, так і паза калгасам, пад лёзунгам: «усё роўна плану ня выканаем, сыпацца няма куды». У некаторых сельсаветах кулацтва выкарыстоўвае ў сваіх інтарэсах Манчжурскія падзеі і вядзе агітацыю супроць стварэньня насенных фондаў «бо ўсё роўна вясной пачнецца вайна і калгасы разваляцца».

Правааапартуністычныя элемэнты, трымаючы стаўку на самацёк, дапамагаюць кулаку ў яго падрыўной рабоце. Характэрна, што правааапартуністычная практыка дзе-ні-дзе пераплятаецца з «лявацкімі» загібамі ў зборы насеньня. У калгасе «Маяк» стаўка на самацёк прывяла да таго, што па сёньняшні дзень засталіся неабмалочанымі лён, канопілі, канюшына, авёс.

«Очковтирательство» ў засыпцы насенных фондаў практыкуецца ў значнай частцы калгасаў. Яно палкам і поўнасьцю зьяўляецца адлюстраваньнем кулацкага ўплыву на пасобныя зьвены партыйнай арганізацыі, прытупляе клясавую пільнасьць і дэзарыентуе масы калгасьнікаў у выкананьні важнейшай задачы.

Кіраўнікі калгасу «Ленінскія дні», Бельскага сельсавету, на працягу некалькіх месяцаў займаліся «очковтирательством» у адносінах да раённых арганізацый, запаўняючы аб поўнай засыпцы насеньня. На самай жа справе выкананьне пляну засыпкі насеньня складае па збожжавых культурах толькі 75 проц., а па бульбе—58 проц. Кулак у гэты-ж час праводзіў сваю падрыхтоўчую работу, агітуючы за разьмеркаваньне «мнімых лішкаў», трымаючы курс на разбазарваньне насенфондаў і зрыў пасеўнай кампаніі. І трэба сказаць, што з прычыны палітычнай тупасьці, прытупленьня клясавай пільнасьці асобных кіраўнікоў ячэйкі і сельсавету, кулаку ўдалося сям-там ажыцьцявіць свае пляны.

Ці ёсьць магчымасьць у раёне поўнасьцю выканаць плян засыпкі насеньня. Бязумоўна, ёсьць. Для гэтага трэба разгарнуць адпаведную масавую работу сярод калгасьнікаў, бедняко-ў і сярэдняко-ў—аднаасобнікаў.

Практыка работы па рэалізацыі аблігацый пасеннай пазыкі імя конкурсу «Правды» ў Бацьвінаўскім сельсавеце паказала, што праз мабілізацыю ўласных рэсурсаў калгасьнікаў можна ня толькі выканаць, але і перавыканаць плянавыя заданьні.

Рост палітычнай актыўнасьці перадавой часткі калгасьнікаў, іх аддапасьць справе сацыялістычнага будаўніцтва дае поўную магчымасьць з посьпехам рэалізаваць плян 3 бальшавіцкай вясны. Трэба толькі ўмець арганізаваць гэту актыўнасьць, стаць на чале яе, накіраваць яе на шляху сацыялістычнага будаўніцтва.

Між тым частка мясцовых работнікаў замест таго, каб пайсьці да калгасьніка, талкова растлумачыць яму нашы пляны, замест таго, каб весьці з ім глыбокую масавую работу, абмяжоўваюцца паралнай балбатнёй, гастраляёрскімі наездамі і г. д. Клясычным прыкладам такой павярхоўнасьці і алілуйшчыны можа быць той факт, што прадстаўнік РайКК РСІ Зяньковіч В. умудрался за адзін дзень абсьледаваць 3 сельсаветы аб іх падрыхтоўцы да сяўбы і зрабіла па пасяджэньні прэзыдыуму РайКК «дакладныя вывады», упусьціўшы такую «дробязь» як засыпка насенных і страхавых фондаў.

Старшыня райкалгассаюзу Лаўрэнаў, прасядзеўшы каля 20 дзён у калгасе «На стражы», ня толькі не пацікавіўся становішчам засыпкі насеньня, але нават не запытаўся ў кіраўнікоў калгасу, ці ведаюць яны колькі ў калгасе ёсьць насеньня. Да рэчы кажучы, да сёньняшняга дня старшыня калгасу ня ведае і сам, колькі ў яго ў калгасе ёсьць кашоў бульбы, ня кажучы ўжо аб тым, што ня можа даць вестак аб агульнай колькасьці насенных фондаў.

Дзякуючы шырока-разгорнутай масавай работе сярод калгасьнікаў Бацьвінаўскага сельсавету на рэалізацыю насенных аблігацый імя конкурсу «Правды» за 4 дні па грубых падліках сабрана звыш 2.000 пуд. рознага насеньня. Ёсьць выпадкі, калі калгасьнікі ўносілі ў фонд сацыялістычнай узаемадапамогі на 200 пуд. бульбы. Рады выпадак, калі калгасьнік зусім адмаўляўся запоўніць аблігацыю.

Актыўнасьць калгасьнікаў, іх зацікаўленасьць поўнасьцю абсемяніць пасеўплошчу 1932 году сказваецца ў тым, што сама маса калгасьнікаў прымае актыўны ўдзел у распаўсюджаньні насенных аблігацый. Створаны па сельсавеце брыгады па рэалізацыі аблігацый, арганізуецца перакліч паміж калгасамі, бяруцца па буксір адстаючыя. Гэтыя формы масавай работы атрымалі сваё шырокае распаўсюджаньне па ўсім сельсавеце. Адсюль трэба зрабіць толькі адзін вывад — што там, дзе партыйныя ячэйкі па-бальшавіцку ўзяліся за мабілізацыю ўнутраных рэсурсаў, там ужо ёсьць вынікі.

У пропілегласьць Бацьвінаўскаму сельсавету магчыма прывесьці суседні Касьцюковіцкі сельсавет, кіраўнікі якога ігнаруюць масавую работу, паапартуністычнаму адносяцца да мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў і не выпік сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў не сабрана ніводнага кілёграму насеньня.

Вельмі вялікую ролю ў засыпцы насенных фондаў адыгрывае міжкалгасная узаемадапамога. Пры правільнай пастаноўцы работы праз сацыяўзаемадапамогу магчыма ліквідаваць нехват насенных фондаў у радзе калгасаў. Аднак, галоўнейшай перашкодай у ажыцьцяўленьні гэтага важнейшага мерапрыемства зьяўляюцца кулацка-месьніцкія тэндэнцыі з боку асобных кіраўнікоў калгасаў. Па калгасах 5-ці сельсаветаў Крычаўскага раёну, якія не абслугоўваюцца МТС, ёсьць лішні насеньня — аўса 384 цэнтн., пшаніцы — 338 цэнтн., грачкі 360 цэнтн., гароху — 30 цэнтн. і г. д., у той жа час па іншых сельсаветах насеньня гэтых культур не хапае.

Калі-ж перад некаторымі кіраўнікамі калгасаў было пастаўлена пытаньне аб выначэньні поўнай колькасьці насеньня ў фонд сацыялістычнай узаемадапамогі паміж калгасамі, пасобныя з іх ухітрыліся літаральна на працягу 1 дня два разы зьмяняць лічбы насенных фондаў у бок зьмяншэньня іх. Імкненьне пасобных кіраўнікоў калгасаў замкнуцца ў рамкі свайго калгасу, не выпускаць з сваіх рук ніводнага кілё лішку насеньня ёсьць праяўленьне горшага віду апартунізму на сучасным этапе. І сапраўды такое імкненьне цалкам і поўнасьцю супадае з праграмай кулака, які агітуе за тое, каб «ні аднаго кілё калгаснага ўраджаю ня здаць пралетарскай дзяржаве і не дапамагчы нашаму калгасу».

Месьніцкія тэндэнцыі праяўляюцца ў розных формах. Даходзіць справа да таго, што ў некаторых калгасах пасьля поўнай засыпкі насенных фондаў застаюцца яшчэ не абмалочанымі і некаторыя культуры, якія пачынаюць псавацца. Гэтыя калгасы зараз ня ў стане іх абмалаціць. Ня гледзячы на гэта, яны пярэчаць супроць перадачы гэтых культур, тым калгасам, у якіх не хапае насеньня і якія могуць яго абмалаціць і гэтым самым выратаваць насеньне ад пагібелі (калгас «Маяк»). Тут ужо кулацка - месьніцкія тэндэнцыі перарастаюць у крымінальнае злачынства.

Партыйныя арганізацыі павінны

Неадкладна закончыць рэарганізацыю загатоўчага апарату

Па прыкладзе Дрысы і Суражу дабіцца стопроцантнага выканання пляну мясазагатовак кожным раёнам, сельсаветам, саўгасам і калгасам

Перабудавацца на ходу

На 26 сакавіка квартальны план жывёлазагатовак выкананы па БССР на 41,7 проц. — прырост за пяцідзеўку 3,7 проц. Па буйнай рагатай жывёле загатоўлена 64 проц. пляну, сьвіньнях — 13,5 проц., авечках — 45,6 проц. Калгасы здалі 58,7 проц., калгасьнікі і аднаасобнікі—38 проц.

Такія тэмпы жывёлазагатовак сталіць пад пагрозу рэалізацыю вызначаных плянаў і самым адмоўным чынам адбіваюцца на снабжэньні мясам пралетарскіх цэнтраў.

Адна з асноўных прычын недапушчальнага адставаньня ў жывёлазагатоўках — дэмабілізацыя многіх мясцовых арганізацый і галоўным чынам загатоўчага апарату.

Дырэктыва партыі і ўраду аб сканцэнтраваньні жывёлазагатовак у адзінай арганізацыі — сыстэме наркамсагаса аб'яднаньня «Загатжывёла» — мае на мэце ўзмацніць загатоўкі, зьнішчыць усе недахопы, якія выяўлялі в распыленьня гэтай работы паміж спажывецкай кааперацыяй і с.-г. кааперацыяй і Саюзмясам. Але зусім зразумела, што гэта рэарганізацыя павінна была быць праведзена па-баявому, па-ходу. Рашаючае значэньне жывёлазагатоўчага пэрыяду не дазваляе нават найменшага аслабленьня работы загатоўчага апарату.

Між тым, весткі, якія ёсьць у распараджэньні рэдакцыі, сьведчаць аб тым, што рэарганізацыя недапушчальна зацягваецца. Жывёлазагатоўчы апарат БССР, захоплены рэарганізацыяй, фактычна прыпыніў сваю аперацыйную дзейнасьць.

З 75 раёнаў толькі атрымалі Бялыніцкі аформіў стварэньне раённай канторы Загатжывёлы. У радзе буйных раёнаў — Асьвейскім, Сіроцінскім, Крупскім, Талачынскім, Гомельскім, Менскім, Дуброўенскім, якія павінны даць у сярэднім па 2.000 цэнтн. мяса кожны, замест загатоўчага апарату, фактычна — пустое месца.

Дрэнна і ў цэнтральным апараце Белжагатжывёла. Ня гледзячы на тое, што з моманту пастановы ЦК і СНК прайшло больш месяца, апарат не ўкамплектаваны работнікамі, ня мае памяшканьня для работы. Белмяса перадало двух эоатэхнікаў, але ў тойжа дзень яны перайшлі на работу ў Наркамзем, спэцыяліст па транспартаваньні жывёлы перайшоў у Дзяржплян. Белкаапсаюз перадаў загатжывёле пайгорных работнікаў — аднага статыстыка і двух інжынэраў, а плянавіка і бухгальтара пакінуў сабе.

Загатжывёла, да якой перайшло плянаваньне жывёлазагатовак, ня мае ні аднаго плянавіка і нават бухгальтара. З гэтай прычыны **плян загатовак на другі квартал да гэтага часу не прапрацаваны і ня спушчаны на месцы.** Белмяса толькі гэтымі днямі пачало дырэктыву мясцом аб перадачы баз канторам Загатжывёлы. Наркамснаб да апошняга часу дапамагаў толькі цыркулярамі.

Такая «дапамога» з боку некаторых цэнтральных і раённых устаноў, разумела, ня спрыяе разгортваньню жывёлазагатовак.

Рэарганізацыя жывёлазагатоўчага апарату павінна быць скончана ў бліжэйшыя-ж дні. Мясцовыя партыйныя і савецкія арганізацыі абавязаны аказаць самую актыўную дапамогу жывёлазагатоўчаму апарату ў выкананьні пляну загатовак.

За пасьпяховую рэалізацыю пляну

Дрыса і Сураж прэміяваны прамтаварамі на 20.000 р.

На 16 сакавіка Дрысенскі раён выканаў плян жывёлазагатовак на 109 проц., Сураскі раён — на 101,7 проц.

За пасьпяховую рэалізацыю пляну СНК БССР прапанаваў Наркамснабу завезьці ў Дрысенскі і Сураскі раёны праз раённыя аддзяленьні Загатжывёлы прамтавараў на 10.000 руб. кожнаму раёну для снабжэньня калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, якія выканалі поўнасьцю свае абавязкі перад дзяржавай.

Не арганізатары загатовак, а звычайныя прыёмшчыкі

КАПЫЛЬ.

Капыльскі раён дае найгоршыя паказальнікі ў выкананьні плянаў жывёлазагатовак. Заданьне рэалізавана на 18 проц. Райзагатжывёла бязьдзейнічае. 4 інспэктары канторы пінскай работы па арганізацыі загатовак не вядуць, а скарыстоўваюцца, як прыёмшчыкі або як разьнікі пры бойні.

З-за нядбайнасьці загатоўшчыкаў жывёла на базе ня кормяцца па дваТры дні. Кармовы фонд у 40 тон сена чамусьці перададзены саўгасу «Цімкавічы» і інш.

У раёне вельмі пашыран драпежніцкі забой жывёлы. У некаторых выпадках складаліся акты, але міліцыя і пракуратура абмяжоўваюцца тым, што накладаюць штраф ад 10 да 30 руб.

Такія прыміркчныя адносіны да драпежніцкага забою і разбазарваньня жывёлы даюць магчымасьць прыватніку спэкуляваць мясам на рынку.

Брыгада:
Фядулаў, Маскалёва, Васілеўскі, Каробкіна.

14,2 проц. пляну—вынік адсутнасьці масавай работы

ВІЦЕБСК. (Наш кар.).

Мясазагатоўчая кампанія ў Віцебскім раёне недаацэньваецца. Квартальны плян выкананы на 41 проц. Запазычанасьць дзяржаве складае 1.266 цэнтн. мяса.

Загатоўка праходзіць галоўным чынам за лік буйнай рагатай жывёлы. Зусім ігнаруюцца сьвіньні. Аб гэтым з усёй нагляднасьцю сьведчыць выкананьне пляну па загатоўцы сьвіней усяго на 6,2 проц.

Ігнараваньне масавай работы сярод аднаасобных бядняцка - серадняцкіх гаспадарак у некаторых сельсаветах прывяло да таго, што аднаасобным сэктарам плян выкананы усяго на 14,2 проц. Некаторыя мясцовыя арганізацыі не правяраюць выкананьне кантрактантамі сваіх абавязацельстваў, не праяўляюць рашучасьці да кулакоў і заможнікаў, якія ня выконваюць цьвёрдых заданьняў па мясазагатоўках.

Недапушчальным трэба лічыць становішча ў саўгасах і прыгарадных гаспадарках. Замест 150 цэнтн. мяса імі здана толькі... 2 цэнтн. Саўгас «ТыраспоЛь» замест 7,5 цэнтн. ня здаў нічога. Дырэктар саўгасу **Мікалаеў** кажа: «Мясазагатоўкі мяне не датычаць». У той-жа час ёсьць факты разбазарваньня мясной прадукцыі ўнутры прыгарадных гаспадарак і саўгасах.

Арк. Зарубежны.

Растуць рады ўдарнікаў ляснога фронту

ДЗЕСЯЦЬ ПЕРАДАВЫХ ЛЕСПРАМГАСАЎ ДАТЭРМІНОВА ВЫКАНАЛІ ПЛЯНЫ ЛЕСАЗАГАТОВАК І ВЫВАЗКІ

Вучыцца на вопыце лепшых

Другая палова сакавіка дала рад ясьцігненьняў у выкананьні пляну лесазагатовак. Ужо на 20 сакавіка мы мелі 6 перадавых леспрамгасаў, якія датэрмінова выканалі квартальныя заданьні па загатоўцы і вывазцы лесу. Сёньня мы зьмяшчаем рапарты ня-чтэ 4, якія дабіліся перамог на лясным фронце.

Гэтыя посьпехі яркa сьведчаць аб тым, **што пляны лесазагатовак зусім рэальны,** што пры шырокай мабілізацыі калгасных і бядняцка - серадняцкіх мас на барацьбу за лес яны ня толькі выконваюцца, але і з посьпехам перавыконваюцца.

Агнак, ня гледзячы на гэтыя дасягненьні, агульны плян па лесавывазцы па БССР выконваецца нездавальняюча. Паводле зводкі Лесбелу, якую мы сёньня друкуем, квартальнае заданьне па вывазцы дзелавой драўніны па 25-га сакавіка выканана на 82,2 проц., па вывазцы дроў—на 79,3 проц.

Значная частка леспрамгасаў (Сеньненскі, Нараўлянскі, Плешчаніцкі, Касьцюковіцкі, Дуброўенскі, Бешанковіцкі, Буда - Кашалёўскі, Віцебскі, і рад інш.) па-ранейшаму галёбаз адстаюць у лесавывазцы. Партыйныя, савецкія, прафсаюзныя і калгасныя арганізацыі гэтых раёнаў дагэтуль ня здолелі па-бальшавіцку мабілізаваць масы па хутчэйшае завяршэньне пляну.

Праз два дні канчаецца квартал. Перад усімі раённымі партыйнымі арганізацыямі стаіць адказнейшая задача—скарыстаць першую палову красавіка, тыя дні, калі ня-чтэ будзе стаяць санная дарога, для узмацненьня тэмпаў лесавывазкі, для пакрыцьця запазычанасьці першага кварталу.

Вопыт перадавых леспрамгасаў, якія дабіліся ня толькі выкананьня, але і перавыкананьня сваіх плянаў, павінен быць выкарыстана перапесены і скарыстан у практыцы ўсіх леспрамгасаў БССР. Толькі шырокая мабілізацыя калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас, фанучая барацьба з дэмабілізацыйнымі настроямі, з апартуністычнымі разважаньнямі аб нерэальнасьці пляну, з кулацкім сабатажам, накіраваным на зрыў лесавывазкі,—забясьпечыць перамогу ў выкананьні пляну лесавывазкі. Перадавыя леспрамгасы павінны ўзяць адсталых па граматнасьці буксір.

Зводка лесазагатовак і вывазкі на 25 сакавіка 1932 г.

НАЗВА ЛЕСПРАМГАСУ	ЗАГАТОЎЛЕНА у процантах да квартальнага заданьня: Лесматар'ялу	Дроў	ВЫВЕЗЕНА у процантах да квартальнага заданьня: Лесматар'ялу	Дроў
Аршанскі	165,8	199,6	79,6	170,4
Асіпавіцкі	146,0	93,8	60,2	70,0
Бабруйскі	125,2	90,5	77,1	79,2
Барысаўскі	113,3	113,5	93,4	106,5
Гарамільскі	114,9	88,4	73,8	72,9
Бешанковіцкі	86,1	12,6	54,3	56,2
Бялыніцкі	123,0	117,5	66,7	96,4
Бярозінскі	135,5	64,6	90,7	99,9
В.-Кашалёўскі	95,4	70,3	63,6	57,5
Быхаўскі	94,7	84,0	62,3	75,5
Веткаўскі	103,4	100,5	98,4	113,1
Віцебскі	105,8	48,1	69,9	50,4
Вузьзвенскі	74,8	127,9	136,9	69,0
Вушацкі	170,5	44,1	54,5	19,0
Гомельскі	155,7	105,4	79,6	90,0
Горацкі	130,6	73,8	76,4	72,0
Глускі	107,1	132,7	160,1	67,0
Дуброўенскі	50,8	67,8	37,9	74,0
Жыткавічкі	143,6	124,2	100,2	104,9
Касьцюковіцкі	153,5	113,9	72,1	56,1
Клімавіцкі	120,4	174,2	67,6	100,9
Клічаўскі	141,1	90,1	79,2	70,9
Койданаўскі	81,7	77,8	67,4	114,1
Крупскі	99,8	75,0	107,8	103,0
Лагойскі	114,9	150,0	101,5	226,0
Лёзьнянскі	55,8	76,5	81,9	79,5
Лепельскі	123,0	95,4	79,4	66,3
Лоеўскі		148,1	144,7	169,7
Любаньскі	28,2	134,3	69,8	62,0
Магілеўскі	141,6	61,8	86,7	79,7
Менскі	85,8	70,3	55,8	97,1
Нараўлянскі	174,9	90,2	62,9	56,1
Парыцкі	99,1	97,7	61,8	63,2
Плешчаніцкі	48,1	100,9	52,3	44,5
Полацкі	360,4	145,2	152,6	69,2
Прапойскі	72,2	41,5	82,0	47,0
Рагачоўскі	235,2	109,8	101,2	100,6
Рэчыцкі	159,4	102,8	105,9	101,3
Сенненскі	61,4	54,2	52,8	40,1
Сіроцінскі	72,2	95,8	50,4	94,9
Смалявіцкі	87,6	173,5	94,6	86,1
Слуцкі	84,6	166,2	66,0	84,9
Сураскі	112,7	115,7	100,6	100,2
Тураўскі	122,8	73,6	130,0	138,6
Чэрвеньскі	110,3	163,4	84,4	95,0
Чачарскі	116,3	61,9	77,2	53,9
Чыр.-Польскі	116,3	67,9	84,1	74,6
Чыр.-Слабодзкі	71,6	54,9	105,8	117,7
Шклоўскі	131,0	60,6	40,2	71,2
Усяго па БССР	119,8	91,4	62,2	79,3

Калгас „Будаўнік"--лепшы па лесавывазцы

ВУЗДА. Калгас «Будаўнік» (Вузьдзенскі раён), ідучы ў перадавых радох па выкананьні ўсіх гаспадарчых плянаў, не адстае і ў лесавывазцы. На 15 сакавіка квартальнае заданьне выканана на 100,7 проц.; замест 1.400 кбм. паводле пляну вывезена 1.500 кбм.

Гэтых посьпехаў калгас дабіўся дзякуючы правільнай арганізацыі працы і ўдарнай рабоце возчыкаў. Асабліва добра працуе па лесавывазцы брыгада тав. **Казлоўскага Кастуся,** якая больш за ўсіх перавыконвае нормы.

Змагаючыся за выкананьне сустрэчнага пляну, калгас узяў на сацыялістычны буксір калгас «28-га жніўня», які па 15 сакавіка выканаў квартальнае заданьне толькі на 65 проц.

Трэба адзначыць, што прамтаварны фонд, які быў вызначан леспрамгасу па прэміяваньне лепшых ударнікаў, разбазаран прарабам вучастку Нікановічам на іншыя мэты. У выніку калгас зусім нічога не атрымаў для прэміяваньня сваіх ударнікаў.

Возчык.

Бабруйскі леспрамгас згарнуў тэмпы

БАБРУЙСК. (Наш кар.).

Ня гледзячы на тое, што рад сельсаветаў і калгасаў Бабруйшчыны датэрмінова выканалі плянавыя заданьні па лесавывазцы, ажыцьцяўленьне агульнага пляну па леспрамгасе ўсё яшчэ нездавальняючае. На 25 сакавіка квартальнае заданьне па вывазцы дзелавой драўніны выканана на 77,1 проц., па вывазцы дроў — на 73,2 проц.

Райком саюзу лесдрэварабочых пе забясьпечыў рэалізацыі ўзятых перад усебеларускім зьездам прафсаюзаў самаабавязацельстваў па ўзмацненьні лесавывазкі. Абвешчаны дэкадник штурму ня быў шырока папулярызаваны на мясцох, непасрэдна ў лесвучастках, сельсаветах і калгасах. У Гарадзецкі лесвучастак прадстаўнік райкому зьявіўся ў канцы дэкадніка.

Броскі лесвучастак зьяўляецца самым адсталым па лесавывазцы. Аднак, кіраўніцтва гэтага вучастку ня прымае належных захадаў да разгортваньня арганізаванага набору возчыкаў. У выніку пануе поўны самацёк і дэмабілізацыйныя настроі. Замест 600 патрэбных фурманак штодзенна выжджае толькі 100. Прараб вучастку **Взэйнбэрг** замест мабілізацыі мас займаецца апартуністычнымі разважаньнямі аб тым, «што ўсё роўна пляну ня выканаем».

Рапарты пераможцаў

ЖЫТКАВІЧЫ. (Па тэлеграфу). У выніку шырокай мабілізацыі мас на барацьбу за лес, пад кіраўніцтвам раённай партарганізацыі, Жыткавіцкі леспрамгас датэрмінова (25 сакавіка) выканаў плян першага кварталу: па загатоўцы дзелавой драўніны на 143,6 проц., дроў — на 124,2 проц.; па вывазцы адпаведна — 100,2 проц. і 104 проц.

Дырэктар леспрамгасу **ГЕРАСІМОВІЧ.**
Сакратар парт'ячэйкі **АНТАШЭЎСКІ.**
Старшыня рабочкому **ДОРТУЗАЎ.**

* * *

РЭЧЫЦА. (Па тэлеграфу). Пад кіраўніцтвам райкому КП(б)Б пры актыўным удзеле партыйных, савецкіх, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый раёну плян лесазагатовак і вывазкі першага кварталу па Рэчыцкім леспрамгасе на 20-га сакавіка выканан: па загатоўцы дзелавой драўніны на 154,5 проц., дроў — на 100,6 проц., па вывазцы дзелавой драўніны — на 103,6 проц., дроў — на 100 проц.; па загатоўцы экспартнага сырцу — на 109,4 проц., па вывазцы— на 118,3 проц.

Разгорнута праца па выкананьні сустрэчнага пляну і пераапрацоўцы экспартнага сырцу.

Дырэктар леспрамгасу **ЯРМОЛІН.**
Сакратар парт'ячэйкі **ХАЙКІН.**
Старшыня рабочкому **ПАПОЎ.**

* * *

СУРАЖ. (Па тэлеграфу).

На аснове разгортваньня шырокай масавай работы вакол лесазагатоўчай кампаніі, пад кіраўніцтвам раённай партарганізацыі Сураскі раён дабіўся ня толькі выкананьня, але і перавыкананьня квартальнага пляну лесазагатовак і вывазкі. На 25-га сакавіка заданьне па загатоўках дзелавой драўніны выканана на 112,7 проц., дроў — на 115,7 проц., па вывазцы дзелавой драўніны на 100,6 проц., па вывазцы дроў — на 100,2 проц.

Нам. сакратара РК КП(б)Б **КІЛЬБАН.**
Дырэктар леспрамгасу **МУХАЕЎ.**

* * *

РАГАЧОЎ. (Па тэлеграфу).

Рагачоўскі камсамольскі леспрамгас, пад кіраўніцтвам раённай партарганізацыі, шляхам перабудовы сваёй работы датэрмінова (20 сакавіка) выканаў плян першага кварталу па лесазагатоўцы і вывазцы. Квартальнае заданьне па загатоўцы лесматар'ялу выканана на 234,7 проц., дроў — на 109,2 проц.; па вывазцы адпаведна — 100 і 100,3 проц.

Дырэктар леспрамгасу **ПЫЖ.**
Сакратар парт'ячэйкі **КАНДРАЦЕНКА.**

Прэміі ударнікам ляснога фронту

ЛЕЗБЕЛ ВЫЛУЧЫЎ ПРЭМІІ ЛЕПШЫМ УДАРНІКАМ ЛЯСНОГА ФРОНТУ — РАБОТНІКАМ РАЁНАЎ, СЕЛЬСАВЕТАЎ І КАЛГАСАЎ, ЯКІЯ ДАТЭРМІНОВА ВЫКАНАЛІ КВАРТАЛЬНАЕ ЗАДАНЬНЕ ПА ЛЕСАЗАГАТОЎКАХ І ВЫВАЗЦЫ. ПА РАГАЧОЎСКІМ ЛЕСПРАМГАСЕ ВЫЛУЧАНА ПРЭМІЯ У 3.000 РУБ., РЭЧЫЦКІМ — 6.000, ЧЫРВОНА-СЛАБОДЗКІМ — 1.500 РУБ.

Адміністраваньнем замянілі аперацыйнае кіраўніцтва

БЯЛЫНІЧЫ. Бялыніцкі леспрамгас па 25 сакавіка квартальнае заданьне па вывазцы дзелавой драўніны выканаў па 86,7 проц., на вывазцы дроў — па 96,4 проц.

Кіраўніцтва леспрамгасу, зусім правільна, зараз асноўную ўвагу накіравала па фарсаваньне тэмпаў вывазкі лесматар'ялу. Аднак, пастаўленая задача ажыцьцяўляецца зусім шкадзільнымі і шкоднымі мэтадамі. Усім возчыкам у адміністрацыйным парадку загадана спыніць возку дроў. Лясная варта часта скідае дровы з вазоў. У тых возчыкаў, якія працягваюць вазіць дровы, прыёмшчыкі адмаўляюцца прымаць іх; не даюць гэтым возчыкам праматвараў і фуражу. У выніку значная частка возчыкаў зусім кінула вяжджаць на лесавывазку. Ініцыятарам такіх «мэтадаў» зьяўляецца адзін з адказных працаўнікоў леспрамгасу тав. **Сапега.**

СЕЧКА.

Прыйсьці да другога кварталу з перамогай у барацьбе за прамфінплян

Сакавік даў пэўны зрух

Апошнія весткі аб выкананьні прамфінпляну па прадпрыемствах ВСНГБ гавораць аб НЕКАТОРЫМ ПАЛЯПШЭНЬНІ РАБОТЫ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ У САКАВІКУ ГЭТАГА ГОДУ. Прадпрыемствы ВСНГБ за 26 дзён сакавіка выканалі месячны прамфінплян на 60 процантаў, што нас яшчэ задавольніць ня можа.

Вялікі зрух у выкананьні прамфінпляну дасягнут па МЭТАЛЯАПРАЦОЎЧАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ: калі за першую дэкаду сакавіка месячны плян быў выканан на 26 проц., то за другую дэкаду тэмпы ўзьняліся да 62,9 проц. (за 20 дзён). На першым месцы па мэталяапрацоўчай промысловасьці ідуць заводы сельгасмашынабудаўніцтва, з якіх Гомсальмаш даў 91,8 проц. месячнага заданьня, а «Чырвоны мэталіст» — 70,4 проц.

Па-баявому змагаюцца за выкананьне вытворчых заданьняў, за ажыцьцяўленьне сустрэчнага пляну ГАРБАРНЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ БССР. Яны выканалі за 29 дзён сакавіка 71,2 проц. месячнай праграмы.

Палепшылася работа пёгкай промысловасьці, якая здавальняе патрабаваньні шырокіх мас: абутковыя і швейныя фабрыкі далі 60,9—63 проц. месячнай праграмы.

Вельмі дрэнна працуюць і зьніжаюць агульныя вынікі барацьбы за прамфінплян ПАПЯРОВЫЯ ФАБРЫКІ, якія выканалі толькі 29 проц. пляну.

На іх работу самым адмоўным чынам адбіваецца нездавальняючая праца торфаводаў, што абслугоўваюць прадпрыемствы папяровай прамысловасьці.

Асноўнымі прычынамі зрыву ў выкананьні прамфінпляну зьяўляюцца посьпехі ў ПЕРАБУДОВЕ КІРАЎНІЦТВА ПРАДПРЫЕМСТВАМІ Ў РАДЗЕ МЕСЦ НА АСНОВЕ 6 УМОЎ ТАВ. СТАЛІНА, наближэньне парт.-прафработы да цэху і брыгады. Станоўчую ролю адыграла таксама значнае палепшэньне становішча на 1-й БелДРЭС.

Заметні з віцебскай акулярнай фабрыкі і швейнай фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі», якія дэманструюць, як рабочыя калектывы, пад кіраўніцтвам фабрычных арганізацый, дабіліся перамогі, як змаглісь яны за бальшавіцкія тэмпы.

Баявая задача ўсіх фабрычна-заводзкіх арганізацый—самацаваць дасягнуты зрух, дабіцца поўнага 100 проц. выкананьня ўсіх колькасных і якасных паказальнікаў прамфінпляну першага кварталу.

Перабудова кіраўніцтва прывяла да посьпеху

ВІЦЕБСК. Акулярная фабрыка імя Розы Люксэмбург выканала прамфінплян 1931 году толькі на 65,5 проц. У студзені гэтага году фабрыка недадала дзяржаве прадукцыі на 130.000 руб. Прычыны гэтага адставаньня хаваліся выключна ў рабоце па-старынцы, у зусім нездавальняючай рэалізацыі 6 ўмоў.

Па апошні час фабрычныя арганізацыі па-бальшавіцку ўзяліся за работу па-новаму. Партыйная і прафсаюзная работа перанесена ў нізавыя вытворчыя зьвёны. На ўсіх вучастках створаны партгрупы і інстытут прафоргаў. Абноўлена кіраўніцтва зборачнага цэху. Прафкамітэт мэханічнага цэху правёў рад вытворчых нарад у групах і вучастках па пытаньні ліквідацыі адставаньня. Ударніцтвам ахоплена 50 проц. рабочых (раней ударнікаў налічвалася 18 проц.). На ўсіх вучастках вылучаны лідучыя прафэсіі, зарплата якіх адзіным чынам перагледжана. 95 проц. рабочых пераведзены на зьдзельшчыну. За апошні час арганізаваліся 16 новых гаспадарча-разрахунковых брыгад. Брыгада імя Стасавай выконвае сваё заданьне на 118 проц., імя Ланцуцкага — на 135,9 проц.

Творчы ўздым рабочых мас знайшоў сваё адлюстраваньне ў дачы каштоўных рацыяналізатарскіх прапаноў. За апошні час сабрана 92 рабочыя прапановы, больш паловы якіх ужо рэалізавана, што дало каля 19.000 руб. эканоміі.

У выніку прамфінплян за люты выкананы фабрыкай на 110 проц., за першую дэкаду сакавіка — на 116 проц. Месячны плян за 2 дэкады сакавіка выкананы на 68,1 проц.

Акулярная фабрыка зьяўляецца лепшым прыкладам таго, што толькі работа па-новаму забясьпечвае перамогу.

Брыгада:
ВУЗДЗІН, ЗЭЛІКСОН, ЗАРУБЕЖНЫ.

ЗАМАЦАВАЦЬ ПЕРАЛОМ

ВІЦЕБСК. ШВЕЙНАЯ ФАБРЫКА «СЬЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ» Ў СТУДЗЕНІ ВЫКАНАЛА 54,6 ПРОЦ. МЕСЯЧНАГА ПРАМФІНПЛЯНУ, ПЕРШАЯ ПАЛОВА ЛЮТАГА ДАЛА 52,6 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ. ЗА ПАЎТАРА МЕСЯЦА ФАБРЫКА НЕДАДАЛА КРАШЭ ЗБЫШ 46.000 ПІДЖАКОЎ, 27.000 ПАЛІТО, 142.000 ПАР СУКОННЫХ БРУК І 24.000 ПАР ПАПЯРОВЫХ БРУК.

ПЯЦІТЫСЯЧНЫ КАЛЕКТЫЎ ФАБРЫКІ «СЬЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ» ПАРАШЫЎ ВА ШТО-В ТАМ НІ СТАЛА ЗМЫЦЬ ГАНЕБНУЮ ПЛЯМУ. МАСЫ РУШЫЛІСЯ НА ШТУРМ НЕПАЛАДАК НА ФАБРЫЦЫ. КОНКУРС НА ЛЕПШАЕ ПРАДПРЫЕМСТВА І СТАЛІНСКІ ПАХОД НІЗАВОГА ДРУКУ СТАЛІ БАЯВОЙ ПРАГРАМАЙ ДЗЕЯНЬНЯ КОЖНАГА ЦЭХУ І ІСТУЖКІ. ШТОДЗЕННЫ Ў ЦЭХАХ МАБІЛІЗАВАЛІ ЎВАГУ РАБОЧЫХ НА НЕДАХОПАХ НА ПААСОБНЫХ ВУЧАСТКАХ РАБОТЫ. КОЖНЫ ДЗЕНЬ ВЫПУСКАЎСЯ БЮЛЕТЭНЬ АБ ХОДЗЕ ШТУРМУ.

ВЫНІКІ ЎЖО ВЕЛЬМІ ВЯЛІКІЯ. АПОШНЯЯ ПЯЦІДНЕЎКА ЛЮТАГА ДАЛА 100,5 ПРОЦ. ДЭКАДНАГА ПРАМФІНПЛЯНУ. ПЕРШАЯ ДЭКАДА САКАВІКА ДАЛА 102,2 ПРОЦ. МЕСЯЧНЫ ПЛЯН ЗА 2 ДЭКАДЫ САКАВІКА ВЫКАНАНЫ НА 63,1 ПРОЦ.

ПЕРАЛОМ У РАБОЦЕ ФАБРЫКІ ПАВІНЕН БЫЦЬ ЗАМАЦОВАН.

БРЫГАДА:
ЛІПКІН, КУЗЬНЯЦОЎ І КАЗАНСКІ

ПЛАДЫ УРАЎНІЛАЎКІ

БАРЫСАЎ. Рэйд ударных брыгад друку па **Барэзінскім камбінаце** выявіў наяўнасьць ураўнілаўкі амаль ва ўсіх цэхах камбінату. Рад фактаў сьведчыць аб гэтым. У стругальным цэху прыбіральшчык атрымлівае больш кваліфікаванага стругаля. Памочнік стругаля, работа якога патрабуе доўгага навыку, атрымоўвае менш адносчыка трэсак. Кваліфікаваная мацыністка здымачнага цэху атрымлівае аднолькавую зарплату з прыбіральшчыцай і па 5 руб. больш сваёй памочніцы. У цэхах панае бесадказная адносіны машыністаў да варыятаў— апошнія ня чысьцяцца і знаходзяцца ў дрэнным становішчы.

Ураўнілаўка прывяла да таго, што ў асноўных цэхах рад машын стаіць з-за недахвату машыністаў, бо памочнікі атрымліваючы толькі на 5 рублёў менш за машыністаў, матар'яльна не зацікаўлены ў павышэньні кваліфікацыі.

Гаспадарнікі дадумаліся да зусім няправільнага мэтаду аплаты рабочых, якія працуюць на экспарце. Замест таго, каб стымуляваць рост прадукцыйнасьці працы і правесьці прагрэсыўна-прэміяльную зьдзельшчыну, устанавіць цьвёрдыя нормы і расцэнкі, работу аплачваюць па сярэднім заработку. У выніку такой аплаты прадукцыйнасьць працы рабочых вельмі нізкая. Стругаль выробляе ў два разы менш нормы. Амаль такое-жа становішча ў большасьці цэхаў камбінату.

Брыгада «Зьвязды» і «Чырвонага Барэзінца»:
Шмідт, Стронтін, Ліпкін, Савэльзон, Пацзеў, Кац, Лібэрман, Ліпкінд, Лейкін, Пруск, Кульгавы, Мікуліч, Голуб, Энгліна, Левіна, Асташава, Кавалёў, Шаркоў, Касаеў, Качан, Рабцаў, Альшаніцкі, Бродкіна, Сіхончык, Заводзкі, Казлоў, Янучкоў і Нэйдлін.

В. ЯКАБСОН

ФАРСАВАЦЬ ПАДРЫХТОЎКУ ДА НАВІГАЦЫІ

У гэтым годзе грузаперавозкі па водных шляхах БССР павялічваюцца да 690.000 тон супроць 483.700 тон мінулага году. Такі рост перавозак абумоўліваецца агульным разьвіцьцём народнай гаспадаркі, высокімі тэмпамі індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

ЦК і СНК СССР, адзначаючы ў сваёй лютаўскай адозьве 1931 году значнае адставаньне рэчнага транспарту ад тэмпаў разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва, патрабавалі ліквідацыі гэтага адставаньня і адпаведнай у сувязі з гэтым перабудовы работы водніцкіх арганізацый. Лістападаўскі пленум ЦК і ЦКК КП(б)Б вызначыў канкрэтныя мерапрыемствы разьвіцьця Дняпра-Дзьвінскага рэчнага транспарту, якія павінны забясьпечыць поўнае выкананьне пляну перавозак бягучай навігацыі.

Трэба сказаць, што гэтыя мерапрыемствы марудна ажыцьцяўляюцца партыйнымі, прафсаюзнымі і гаспадарчымі арганізацыямі рэчнага транспарту. Гэта выявілася пры праверцы транспартнай групай ЦКК-НК РСІ стану новішча падрыхтоўкі да навігацыі 1932 г.

Да суднарамонту ў большасьці ня была праведзена своечасовая падрыхтоўка. У выніку рамонт зацягнуўся. Толькі на бабруйскіх майстэрнях, дзе плян па суднарамонце складзен быў своечасова і па-дэкадна правяралася выкананьне яго, а вынікі даводзіліся да брыгады і камандзіраў—там плян выкананы. Гомельскія-ж майстэрні плян суднарамонту склалі несвоечасова, уліку ходу работ, а таксама і праверкі выкананьня пляну не наладзілі.

Зусім слабы нагляд за рамонтам быў з боку камандзіраў гомельскіх прыстаняй. Гэта адбілася на якасьці рамонту: ужо мела месца паўторнасьць (параход «Сьценька Разін» і «Штрыпгер»).

Агульны плян суднарамонту як паравога, так і непаравога флёту, хоць і з некаторым спазьненьнем супроць пляну, але ў асноўным выкананы. Толькі па віцебскіх майстэрнях выкананьне пляну па раёне ў сярэднім складае 90 проц. Увага водніцкіх арганізацый павінна быць сканцэнтравана на неадкладным сканчэньні рамонту і праверцы якасьці яго.

На непаравы флёт прыпадае значная частка перавозак. Да 1-га сакавіка па адной суднаверфі, у Веліжы павінны былі быць набудаваны: 18 лайбаў грузападзёмнасьцю ў 100 тон і 17—у пасьцьдзесят пяць тон. Між тым, з прычыны слабага кіраўніцтва з боку Віцебскага райкіраўніцтва і Дняпра-Дзьвінскага рэчнага транспарту, будаўніцтва праходзіць надзвычай марудна. Цалкам набудаваны толькі 4 лайбы—грузападзёмнасьцю ў 65 тон. На 88 проц.—13 лайбаў у 65 тон і на 34 проц. 19 лайбаў—у 100 тон. Партыйныя, гаспадарчыя арганізацыі павінны прыняць рашучыя меры, каб своечасова закончыць набудову непаравога флёту, каб да адкрыцьця навігацыі яны ўвайшлі ў строй.

Без выразнага пляну перавозак немагчыма эфэктыўнае скарыстаньне флёту. Пастановай ураду патрабавалася ад кліентуры не пазьней як да 20 студзеня заключыць умовы на перавозкі. Гэта пастанова поўнасьцю ня выкананa. На 12 сакавіка не заключаны былі ўмовы на значную частку перавозак. Кліентура ў большасьці спасылаецца на «аб'ектыўныя» прычыны. Гомсельхарчпрам, Гомельскі ЦРК, ТПТ не заключаюць умоў таму, што «ня ведаюць яшчэ пляны загатовак». Бошклаабʼяднаньне тлумачыць пежаданьне заключыць умовы тым, што «нельга шкло перавозіць па вадзе, бо яно псуецца». Розныя «аб'ектыўныя» прычыны прыводзіць і фабрыка «Вэзуві», завод «Кал. праца», гомельская будкантора, плодагароднае аб'яднаньне Наркамснабу і г. д. Рэкорд цяганіны паказаў Лесбел, які цягнуў абгаварэньне і заключэньне ўмовы амаль 2 дэкады. Справа, нарэшце, была перадана арбітру, але рашэньне арбітра, як відаць, аказалася для Лесбелу не аўтарытэтным і ён ня спыняў бюракратычнай цяганіны з заключэньнем умовы. Толькі 13 сакавіка была заключана ўмова гомельскай сплаўканторай з ДДРТ, а бабруйская гэта зрабіла 20-21 сакавіка. Апрача таго Лесбел даў сьвядома паменшаную заяўку на перавозкі. У 1931 годзе іх плян складаў 217 тыс. тон, а ў 1932 — пры павялічэньні аб'ёму работ — заяўка была дана на 137 тыс. тон. Зараз Лесбел толькі пачынае выпраўляць сваю грубую памылку.

Якое агульнае становішча з заключэньнем дагавароў? На 13 сакавіка па Віцебскім раёне дагаварамі было ахоплена 79 проц. плянаў грузаперавозак, па Гомелі—60, Бабруйску—53,3 проц. Транспартная пракуратура павінна вывяліць сапраўдныя прычыны такога

ГОЛАД У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

ЭПІДЭМІЯЙ ПЛЯМІСТАГА ТЫФУСУ АХОПЛЕНЫ ЦЭЛЫЯ ПАВЕТЫ

Калёніяльная палітыка польскага фашызму, палітыка барбарскага грабяжніцтва працоўных мас акупаванай Заходняй Беларусі давяла шырокія масы гэтай крайны да поўнай руіны, да голаду. Факт голаду ў Зах. Беларусі пры ўсім сваім стараньні ня можа ўтаіць нават фашыстская улада. Ня гледзячы на суровую цэнзуру, фашыстская віленская проса ў апошнія часы ўсё больш часта зьмяшчае паведамленьні аб голадзе ў Зах. Беларусі, аб эпідэміі розных заразьлівых хвароб, асабліва плямістага тыфусу, аб выпадках галоднай сьмерці сярод сялян на вёсцы і беспрацоўных у горадзе.

«Дзеньнік Віленскі» ў сваім сьвяточным нумары піша літаральна наступнае: «З пасобных паведамленьняў, якія ўплываюць у бягучым годзе быў надзвычай непамысным і цяжкім для земляробаў. І да таго цяжкое становішча сялянства было яшчэ больш пагоршанага бязупынными падатковымі экзэкуцыямі і ліцытацыямі (продаж маемасьці з аўкцыёну). У Дзісьненскім, Браслаўскім і Пастаўскім паветах (якраз у тых, якія асабліва пацярпелі ад паводкі мінулай вясной. — Рэд.) сьць шмат такіх сялян, якія па сьвяты мяюць ня толькі мяса, масла, яйкі і булкі, але нават хлеба і бульбы. Яны проста галадаюць.

Вялікая колькасьць раней заможных сялян жывуць цяпер у надзвычайнай галечы, паўпаўненыя ў заўтрашнім дні — ці не забяруць у іх апошнай каровы, апошняга каня».

На тлебе голаду лютуюць эпідэміі розных заразьлівых хвароб. Зараз фашыцкая проса б'е трывогу аб пашырэньні эпідэміі плямістага тыфусу ў Пастаўскім павеце. Эпідэмія набыла такія пагражаючыя разьмеры, што з Вільні для барацьбы з ёю высланы спэцыяльныя санітарныя атрады.

Далей той-жа фашыцкі «Дзеньнік Віленскі» піша, што ў часе сьвят на вёсцы стаяла справа і ў Вільні. «Тысячы беспрацоўных дарэмна чакаюць працы. Дзяржаўная дапамога ня можа задаволіць нават самых мінімальных патроб беспрацоўных і іх сем'яў. Таму нічога дзіўнага, калі перад харчовымі крамамі і пякарнямі зьбіраюцца сялянскія групы жабракоў і чакаюць дробных аховар. Вуліцы перапоўнены брадягамі і жабракамі, якія сьпяюць амаль кожнага праходжага і просяць падарыць. У прытулках і ў начлежных дамох сотні бязьдомных. Гарадзкія кухні для беспрацоўных проста асаджаюцца натоўпам галодных.

З голаду

На тлебе голаду становіцца ўсё больш частымі выпадкі самагубстваў як у горадзе, так і на вёсцы. Фашыцкі «Кур'ер Віленскі» ў нумары 69 у заметцы пад загалоўкам «Трагедыя нішчаснай уцалы» піша: «23 сакавіка каля фальварку Промны, Ашмянскага павету, у кустох знойдзен труп дзіцяці. Сьледзтвам было ўстаноўлена, што гэты труп дзіцяці ўцалы Яўгіні Садоўскай, якая не магла пракармі́ць дзіця і задушыла яго.

Калі паліцыя зьявілася, каб арыштаваць яе, дык Садоўская пакончыла самагубствам».

Другая фашыцкая газэта «Дзеньнік Віленскі» ад 24 сакавіка падае наступны факт: «Пару тыдняў таму назад з вёскі Вірпуліцкі прыбыў у Вільню 32-гадовы шавец Янка Калінаўскі ў пошуках працы. Аднак, усе яго стараньні атрымаць працу правяліся. Учора праходзячы па Салтаньскай вуліцы, з прычыны голаду і вычарпаньня сіл, ён самлеў і упаў на брук.

Выкліканая карэта хуткай дапамогі адвезла Калінаўскага ў шпіталь, дзе доктар сьцьвердзіў у яго тубэркулёз у апошняй стадыі».

Конь — за 11 коп.

У той час, як мільённыя масы працоўных галадаюць, фашыцкі ўрад на далейшыя ўзбраеньні, на падрыхтоўку інтэрвэнцыі супроць Савецкага Саюзу ўводзіць усё новыя і новыя падаткі, павялічвае раней існаваўшыя. Падатковая шруба запісутна дае адказу. Падатковыя экзэкутары дзён і ночу езьдзяць па вёсках і спаганяюць падаткі, а таксама прадаюць з аўкцыёну за няўпнос падаткаў апошняе сялянскае дабро. Але і гэта мера фашыцкай улады не дапамагае. Галеча працоўных мас дасягнула такой ступені, што зараз няма нават каму і купіць заграбленае сялянскае дабро нават за бесцань. «Дзеньнік Віленскі» ў нумары 69 падае такі факт:

Падатковы экзэкутар у Магільне, бачачы, што ў звычайны дзень ня можна прадаць з аўкцыёну заграбленае за няўплату падаткаў сялянскае дабро, пусьціўся на хітрыкі. Забраўшы ў селяніна пару коняй, накіраваўся на рынак у кірмашны дзень. Аднак, ён строга пралічыўся. Ня гледзячы на тое, што рынак быў перапоўнен людзьмі, пад агульны сьмех прысутных прапанавалі экзэкутару за каня толькі па 50 грошай (11 кап.). У часе торгу цану на каня падняслі да 2 злотых, але калі трэба было плаціць, дык селянін, які прапанаваў 2 злотых, ушёк. Экзэкутар, бачачы, што не праласьць коняй нават па 2 злотых, загадаў адвесьці іх у стайню. Але не знайшлося ні аднаго чалавека, які-б згадзіўся ўзяць коняй да сябе на ўтрыманьне. Нарэшце, знайшоўся адзін, які згадзіўся ўзяць коняй, але за даплату па 10 злотых у дзень.

Правалэшчаўшыся на рынку ўвесь дзень з коньмі, экзэкутар, нарэшце, прывуцян быў з хлапчуком дасьць коні назад іх гаспадару.

Трэба адзначыць, што ўсе вышэйпаданыя факты аб голадзе ў Заходняй Беларусі ўзяты нашы з фашыцкай прэсы за адзін толькі дзень. Зразумела, што ўсе падаўшыя факты гасьпадарчай руіны на ЗБ і голаду, якім ахоплены зараз цэлыя паветы, далёка не адлюстроваюць сапраўднага сьпынавішча шырокіх працоўных мас. У апошнія часы ў фашыцкай прэсе пачалі прарывацца весткі аб тым, што, з прычыны цяжкай зімы, і ў гэтым годзе ва многіх мясцох Зах. Беларусі жыта прыпадзіцца заворвать. Голад у Заходняй Беларусі набывае ўсё больш шырокія разьмеры.

Польска-германская гандлёвая ўмова

БЭРЛІН, 27. Як афіцыяльна паведамляецца, германска-польскія гандлёвыя перагаворы закончаны. Прынятая года паогул апраўляе становішча спраў, якое існавала да мытнай вайны паміж Германіяй і Польшчай, г. зн. да канца 1931 г.

Абодвы бакі падкрэсьліваюць імкненьне не абвастраць мытныя адносіны і па магчымасьці адхіліць мерапрыемствы па абмежаваньні гандлю, якія былі прыняты ў апошні час. Польшча ўводзіць для германскіх тавараў, увоз якіх з канца 1931 году быў забаронен, кантынгенты і максымальныя мыты а Германія перастае абкладаць «звыштарыфнымі мытамі» некаторыя польскія тавары.

У ВАРШАВЕ ПУШЧАН НОВЫ ВАЕННЫ ЗАВОД

ВАРШАВА, 27. У Варшаве, паводле паведамленьня газэты «Палёнія» ад 6 сакавіка пачаў працаваць новы ваенны завод які паміж іншым выпускае сыгналізацыйныя ракеты.

Мільёны — на дальнейшыя ўзбраеньні

ВАРШАВА, 27. Паводле вестак некаторых газэт, перагаворы аб атрыманьні Польшчай ва Францыі пазыкі ў 200 млн. франкаў на «чыгуначнае будаўніцтва» Гдыня — Катавіцы скончаны з посьпехам.

Адначасова ў журналісцкіх колах перадаюць, што ў часе парыскіх перагавораў было ўзьнята пытаньне аб больш шырокай фінансавай дапамозе Польшы. Папярэдняй умовай такой дапамогі павінны быцьцам быць некаторыя дадатковыя абавязацельствы палітычнага характару польскага ўраду ў адносінах Францыі. (ТАСС)

АНГЕЛЬСКА-МАНЧЖУРСКІЯ ПЕРАГАВОРЫ АБ ПРЫЗНАНЬНІ НОВАЙ ДЗЯРЖАВЫ

БЭРЛІН, 27. Паводле пэўных вестак, паміж ангельскімі прадстаўнікамі ў Кітаі і новым манчжурскім урадам пачаліся афіцыяльныя перагаворы аб прызнаньні.

Брытанскія ўлады ў Кітаі ў цяперашні час заклапочаны лёсам мытаў у Манчжурыі і даходу ад гэтых мытаў, якія ідуць на пакрыцьцё даўгоў Кітаю.

Поўнае банкруцтва канцэрну Крэйгера

КАТЫРОЎКА АКЦЫЙ КАНЦЭРНУ НА СУСЬВЕТНЫХ РЫНКАХ СПЫНЯЕЦЦА

СТАКГОЛЬМ, 27. Апублікаванае паведамленьне камісіі, абсьледаваўшай становішча канцэрну Крэйгера, можна расцэньваць, як пацьвярджэньне поўнага банкруцтва канцэрну. Чуткі, якія раней распаўсюджваліся аб яго правільным вядзеньні спраў у канцэрне, пацьвярджаюцца. У паведамленьні заяўляецца, што вядзеньне спраў не дае яснага малюнку транзакцый, якія праводзіліся канцэрнам. Проса вельмі песымістычна ацэньвае паведамленьне камісіі.

Акцыі «Крэйгер толь» можна разьмяняць цяпер, як канчаткова абесцэненыя. У апошні час акцыі прадаваліся ў Стакгольме ад 2 да 5 крон. Няма сумнення, што катыроўка крэйгераўскіх акцый будзе спынена на ўсіх сусьветных фондавых рынках.

Чырвоны сьцяг на званіцы ў Іўры

ПАРЫЖ, 27. Як паведамляе агэнцтва Гавас, учора ночу невядомы прыляз на царкоўнай званіцы ў Іўры (пакалёка ад Парыжу) вялізарны чырвоны сьцяг з надпісам «далоў вайну». Камуністычны муніцыпалітэт у Іўры адмовіўся зьняць сьцяг. Паліцыя выклікала з Парыжу пажарных, якія пры дапамозе пажарнай драбіны зьнялі сьцяг.

АНГЛІЯ СУПРОЦЬ ФРАНЦУСКАГА ПРАЕКТУ „ДУНАЙСКАЙ ФЭДЭРАЦЫІ"

ЛЁНДАН, 27. Ангельскі ўрад паслаў у Бэрлін, Парыж і Рым ноты з прапановай склікаць на другім тыдні красавіка ў Лёндане канфэрэнцыю прадстаўнікоў Англіі, Францыі, Германіі і Італіі для абмеркаваньня праекту «дунайскай фэдэрацыі». Крок брытанскага ўраду разглядаюць у палітычных колах, як контрмеру, накіраваную супроць чутак, якія пашыраюцца французкімі коламі аб дасягнутай згодзе па гэтым пытаньні паміж Францыяй і Англіяй.

Камэнтуючы праект дунайскай фэдэрацыі, «Обсэрвэр» заўважае, што ангельскі ўрад ніколі не згадзіцца на стварэньне якога-б там ні было аб'яднаньня групы краін, накіраванага супроць інтарэсаў Германіі, а таксама не згадзіцца на тое, каб фінансавы кантроль дунайскіх краін знаходзіўся ў руках адной вялікай дзяржавы. Паводле слоў аглядальніка, паміж Берлінам, Прагай і Лёнданам шамячацца адзінства пункту погляду ў гэтым пытаньні.

ПА САВЕЦКІМ САЮЗЕ

УЗНАГАРОДА ОРДЭНАМ ЛЕНІНА РАБОТНІКАЎ ЧЫГУНАЧНАГА ТРАНСПАРТУ

Прэзыдыум ЦВК СССР пастанавіў: за выключныя заслугі ў сацыялістычным будаўніцтве, якія выявіліся ў геройскай рабоце на месцы, у палепшэньні і рэканструкцыі чыгуначнага транспарту, узнагародзіць ордэнам Леніна наступных работнікаў чыгуначнага транспарту:

1. Кіскіма, Уладзімера Аляксандравіча — намесьніка народнага камісарыяту шляхоў зносін;
2) Тарасава, Янку Рыгорава — начальніка брыгады;
3) Дружніна, Янку Матвеевіча — начальніка брыгады;
4) Лезебкага, Уладзімера Міхайлавіча — начальніка брыгады і
5) Васкабойнікава, Васіля Сямёнавіча — камандзіра разьезду Ленінградзкай школы аховы шляхоў зносін.



На здымку: Нова-пабудаваная гасьцініца ў Нова-Сібірску. На першым паверсе разьмешаны кааперацыйныя магазыны.

Новая канструкцыя рэйкавага стыку

МАСКВА. Выкладчыкі Андрэеў і Шастапалаў прапанавалі новую канструкцыю рэйкавага стыку з чатырма шчылінамі замест шасьці ў накладках старога тыпу. НКШЗ пастанавіў зацвердзіць новую стыкавую накладку на 40 тысяч кілёмэтраў шляху, што з'эканоміць 72 тысячы тон мэталю.

Пяцідзеньнік бюро скаргаў

Вытруціць бюракратызм з савецкіх устаноў

(З матар'ялаў рэйду брыгад ЦКК-НК РСІ і „Зьвязды"

Брыгады ЦКК-НК РСІ і газэты «Зьвязда» правялі масавы рэйд па цэнтрэ рэалізацыі шасьці ўмоў т. Сталіна ў савецкіх установах. Брыгады выявілі, што ў шмат якіх установах яшчэ не перабудавана праца па-новаму, не разгорнута самакрытыка і ўдарніцтва, ня зьнішчаны моманты бюракратызму і цягаціны, грубых адносін да наведвальнікаў, з боку пасобных працаўнікоў.

У Наркамасьвеце брыгадзіры сустрэліся з такімі моментамі: наведвальнікаў пасьлядні ад стала да стала і ніхто з працаўнікоў не даваў пэўнага адказу, а іншыя проста гаварылі: «ня ведаю». Большая частка супрацоўнікаў прышла на работу з вялікім спазьненьнем, некаторыя нават, на 2 гадзіны і больш (інспэктар палітасьветы, кіраўнік групы мастацтва і інш.). Рабочы час супрацоўнікаў не загружан. Перад пачаткам работы супрацоўнікі зьбіраліся групамі і расказвалі анэкдоты.

Некаторыя працаўнікі ня ведаюць сваіх функцый. Напрыклад, брыгадзіры запыталіся ў загадчыка сэктару завочнага навучаньня, у якую завочную ВНУ РСФСР можна падаць заяву і якія ўмовы прыёму, дык ён адказаў: «я ведаю аб завочным навучаньні толькі ў межах БСОР, а ў РСФСР — ня ведаю». Адзін з намесьнікаў наркома на зварот брыгады, дзе можна дастаць весткі аб колькасьці пянісьменных і малапісьменных у БССР, адказаў: «ня ведаю». Таксама адказаў і тав. Брыжэвіч. Старшыня мясцкому на запытаньне брыгадзіраў — дзе атрымаць весткі аб колькасьці пянісьменных і малапісьменных — парадзіў зьвярнуцца ў гарадзкую інспэктуру.

Грубасьць і пяўважліва адказвала як брыгадзірам, так і наведвальнікам супрацоўніца сэктару ўліку т. Розман.

Скрынка для скаргаў ёсьць, але ж яна без замка, і скаргі ляжаць па 3 месяцы. Брыгада выявіла заяву бясспрытульнага вучня ФЗВ — Фіньсанава Тодара, які ляжыць хворы і просіць часовай дапамогі; гэта заява ляжала ў скрынцы з 10 сьнежня 1931 году. Такім бядотным адносінам да заяў паваг нельга знайсьці і тлумачэньня.

Побач з такімі агідными зьявішчамі, брыгадзіры адзначаюць добрую работу, пастаўленую ў сэктары ўліку.

У Наркамземе Беларусі брыгада выявіла, што спазьненьні на працу на поўгадзіны — агульнае зьявішча. Працаўнікі ў часе работы займаюцца пабочнымі гутаркамі. У часе наведваньня брыгады працаўнік статыстычнага бюро тав. Шаўчук на працягу дзьвёх гадзін стаяў у калідоры і гаварыў з невядомым таварышом, кожныя 10 хвілін тав. Шаўчука патрабавалі наведвальнікі, а ён усё адказваў «зараз».

Некаторыя працаўнікі бюракратычна адносяцца да наведвальнікаў. Напрыклад, калі наведвальнік папрасіў сакратара сэктару кадраў тав. Пратусевіча пашукаць дакументы, ён адказаў: «зараз прыдзе другі таварыш, дык пашукае». Гэтага «зараз» прышлося чакаць шмат часу.

У габінэтах Наркома, намесьнікаў і загадчыкаў сэктараў адсутнічаюць даведкі аб прыёме наведвальнікаў. На працягу рабочага дня габінэты аднаго намесьніка наркома і намесьніка загадчыка сэктару на жывёлагадоўлі былі зачынены.

На выяўленых недахопах брыгадзіры мелі гутаркі з трыкутнікам.

У гутарцы з сакратаром партыйнай ячэйкі брыгада зрабіла заўвагу аб тым, што ў апараце НКЗБ адсутнічае кніга скаргаў, сакратар ячэйкі адказаў: «я ня ведаю, ці яна паогул патрэбна».

Ёсьць і добрыя бакі ў рабоце апарату НКЗБ. Пераведзена на зьдзельчыну машыннае бюро, дзякуючы чаму ёсьць дасягненьні як па колькасьці, так і па якасьці працы.

У Дзяржпляне работнікі прыходзяць на работу калі хто ўгодзе.

Гэта даказваюць такія факты: у сэктары кан'юнктуры, калі прышла брыгада, сталы знаходзіліся без прапаўнікоў, толькі стаяў адзін прыктыкант. Загатчыка гэтага сэктару брыгада чакала поўгадзіны. Калі яго запыталі, дзе працаўнікі, ён усьміхнуўся, «шмат такіх, як вы бадзяцца, дык кожнаму на будзе даваць справаздачу».

У адным з габінэтаў ля печы стаялі 4 працаўнікі і грэліся. Разам з імі стаяў і загадчык сэктару тав. Альпяровіч, які забаўляў іх сьмешнымі анэкдотамі. Калі брыгадзіры зайшлі ў пакой № 16 і спыталіся, як можна пастучыць на курсы пляніроўкі, дык іх адсылалі ад стала да стала, прышлося абышлі ўсе сталы, якія толькі стаялі ў гэтым пакоі.

Гэта брыгадзіры бачылі ў памяшканьні на Пляцы Волі, а па вуліцы Энгельса іх сустракалі яшчэ горш. На ўсе запытаньні брыгадзіраў апошнія атрымлівалі адказ «ня ведаю».

Беларуская мова ў апараце Дзяржпляну ня ўжываецца, работнікі як паміж сабой, так і з наведвальнікамі гавораць на расійскай мове.

Уцелсаўгэтрэст брыгада прышла раней за ўсіх працаўнікоў, доўга чакала пакуль хто-небудзь прыдзе. Перад пачаткам работы пачаліся гутаркі, сьмех, ніякай увагі ніхто не зьвярнуў на брыгадзіраў.

Каля габінэту загадчыка малочнай гаспадаркі тав. Сьвірнова зьбілася чарга наведвальнікаў, а прыём усё не пачынаўся. Брыгадзіры парашылі патрубаваць. Загатчык тав. Сьмірноў, не чакаючы запытаньня, авансам адказаў: «у мяне няма часу, я рыхтую даклад» і зачыніў дзьверы на ключ. Калі брыгадзіры пастукалі ў дзьверы другі раз, тав. Сьмірноў выскачыў з габінэту абурэны і пачаў крычаць: «не перашкаджайце працаваць». Гэты факт брыгада пажадала запісаць у кнігу скаргаў, але яе не знайшла. Калі адзін з брыгадзіраў запытаў: «Чаму няма кнігі скаргаў» дык тав. Залескі адказаў: «нам кнігі скаргаў не патрэбна, гэта не канцэратыў».

Работнікі ў часе работы ходзяць па ўласных патрэбах, без дазволу адміністрацыі. Асабліва гэта назіраецца ў сэктары малочнай гаспадаркі.

Усе прыведзеныя факты гавораць аб тым, што партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі абсьледаваных устаноў мала займаліся пытаньнем барацьбы з бюракратызмам. Неабходна ў гэтых установах разгарнуць самакрытыку, арганізаваць рабкораў і дадзіцца выпуску насьценгазэт.

Усім ГК, РК КП(б)Б і рэдакцыям газэт

(Аб наборы на завочнае рэдактарскае аддзяленьне курсаў макрсызму).

З сакавіка бягучага году Усесаюзныя курсы марксызму-ленінізму (Масква) арганізуюць завочную падрыхтоўку і перападрыхтоўку кадраў газэтных работнікаў для цэнтральных, абласных і краёвых газэт, для газэт нац. рэспублік і абласьцей, буйных раённых газэт і новабудоўляў. Плян і праграма аддзяленьня складаюцца з наступных асноўных прадметаў:

1) гісторыя УсеКП(б), 2) палітэканомія, 3) тэорыя савецкай гаспадаркі, 4) дыялектычны матэрыялізм, 5) ленінізм. І спэцыяльных прадметаў: 1) марксызм-ленінізм вучэньне аб друку, 2) гісторыя бальшавіцкага друку, 3) друк у сацыялістычным наступленьні. Поўны курс рэд. аддз. ЗКЛМ разьлічан на тры гады. Заняткі на РА ЗКЛМ пачнуцца з 1 сакавіка. Прыём на ЗКЛМ праводзіцца на працягу ўсяго году. Часопісь ЗКЛМ з 1-га нумару за 1932 г. будзе зьмяшчаць матар'ялы для завочнага навучаньня: вучэбны плян, праграмы, лекцыі, заданьні і г. д. Падпіска на часопісь ЗКЛМ прымаецца Парыжскім сэкстэрам Інтэрнацыяналу (Масква, Ільінка, 3).

На завочнае рэдактарскае аддзяленьне будуць прымацца т. т., якія працуюць на газэтнай, партыйнай і грамадзкай рабоце і маюць ня менш 7-гадовага партстажу і вопыт кіруючай парт. сав. і праф. работы на менш 3-х год. Зьмяшчэньне патрабаваньняў стажу будзе дапускацца толькі для рабселькораў-ударнікаў і рабочых выдвуленцаў. Паступаючыя на завочнае аддзяленьне павінны мець агульную тэарэтычную падрыхтоўку, прыкладна ў абёме кампартвузу і ня ніжэй саўпартшкол. Адбор курсантаў-завочнікаў праводзіцца прадстаўленьнямі парткамітэты і зацьвярджаецца ЦК КП(б)Б. Канчатковае зацьвярджэньне завочнікаў праводзіцца мандатнай камісіяй пры ЦК УсеКП(б). Афармленьня залікі неабходна накіраваць у сэктар друку культпропу ЦК КП(б)Б не пазьней 20-га красавіка 1932 г.

Нам. заг. культпропу ЦК КП(б)Б ЗАЛАТУХІН.

Заг. сэктару друку культпропу ЦК КП(б)Б КУРЦІК.

Паведамленьні

— 29 сакавіка, у 6 гадз. веч., у памяшк. ГарКК (Энгельса, 28) адбудзецца пасяджэньне партпрэйкі Мен. ГарКК КП(б)Б, на якім будуць разглядацца наступныя справы: справа т. Кавалёва (трамвайны парк), Солянцьева А. А. (зав. «Камунарка»), Зуеўскага К. І., Шаблоўскага І. В., Маркевіча А. Е., Шаблоўскага А. («Полымя Рэвалюцыі»), Крыгера В. Ф. (Мясакамбінат), Голуба Р. І. (лямпавая ф-ка), Ноіма Л. Г. (ВНСГ), Мордуховіча І. Л. (зав. «ДА»), Фрумкіна (курсы райпартактыву), Базульчыка Х. П., Матусевіча І. К. (Трансгэтрэст), Кулянова (курсы Чырвоных дыпрактароў), Дзімітрыева М. А. (Вадакапалтрэст), Рудзіцкага (зав. «Камунар»), Захарэўскага М. В. (зав. імя Варашылава), Вінаградава Х. К. (ВКС), Мельцэра (ф-ка «Усход»), Жэўніраў А. Е. (зав. «Камунар»), Протаса Е. В. (зав. імя Варашылава), Грытор'ева, Сокала (Мебуд), Шахлая І. А. (Хлебазавод), Прэсман (ф-ка «Усход»), Кукурэка (саўг. «Зялёны Луг»), Азуфрыева Р. Я. (гута «Пралетары»), Ванюшкіна (Белсельгаспаб), Слоушча, Лянін (Уцільокур), Тупальскага, Шуляева Н. А. (Калодзішчы, Ільяшова, Антаноўчыка (МІРК), Брандабойскага (НКФ). Лука ўсіх вышэйпаказаных т. т. і сакратароў яч. абазвалова.

— Партколегія ЦКК КП(б)Б паведамляе, што 1 і 2 красавіка, у м. Плешчаніцах будзе працаваць выязная ПТ ЦКК КП(б)Б пад старшынствам т. Сьцапняк на разглядзе наступных апэляцыйных справаў: на 1 красавіка 1932 г. — Красковіч А. П., Чэбатароная І. С., Шыло Р. Б., Полак С. К. Навіцкі Я. Я. — Бягомль, Крайчанка І. С., Янкоўскі Б. М., Карасік С. Р., Шыронка М. І., Бурай В. — Бярэзіна; на 2 красавіка 1932 г. — Лапковіч Р., Жораў П. М., Курылонка С. П., Лапкевіч П. Я. Крыгін А. А., Куп Ф. М. Бабскі Ф. А., Красоўскі І. І., Салоўскі М. К., Астроўка Ф. І., Лапкевіч У. Я., Савіцкі Ю. І., Шыллоўскі П. Ц., Гапчароў І. Я., Верамеў Г. П. — Плешчаніцы. Яўка вышэйпаказаных т. т. на ПТ ЦКК КП(б)Б абавязкова. Праезд за свой кошт.

— 30 сакавіка, у 6 гадз. веч., у памяшк. аб'яднанага бюро скаргаў ЦКК-НК РСІ Бел. (Савецкая, 55, 1-шы паверх) адбудзецца пасяджэньне аб'яднанага бюро скаргаў з разгляду наступных справаў: справа Падноса, Зацепіна, Каца, садова-гародняй базы БКС, Пазьняка, Палівешка, Саюзтранспорту, Драздо, Чэраховіча, УЭА Лавжына, Сазонава. Усе т. т., якіх гэтыя справы датычаць, павінны зьявіцца. Выклікаюцца рабочыя засяседацелі: Беленькі, Тасман, Кулдзет, Яцуцевіч, Плучык, Маркаў, Іванаў, Гінзбург, Шастакоўскі, Марушка, Даўгаўт (калектар-райная ф-ка «Беларуская»), Сазіч, Гладкі, Брунеўскі, Ласенкоў, Шнарц, Абрамоўскі (малочны завод). Запрашаецца актыў і «ЛК».

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

29 сакавіка 1932 г., у 8 гадзін вечара адбудзецца

АГУЛЬНЫ СХОД ПАРТКАЛЕКТЫВУ ЦЭНТРАЛЬНЫХ ГАЗЭТ

з падсумкам дня Аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.
Яўка ўсіх партыйцаў абавязкова.
(Сход адбудзецца ў рэдакцыі „ЗЬВЯЗДЫ").

31-га сакавіка, у 8 гадзін вечара, у памяшканьні клюбу імя Сталіна (рог Камсамольскай і Інтэрнацыянальнай вул.)

склікаецца

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ СХОД ПРАФАКТЫВУ

ПАРАДАК ДНЯ:

Вынікі Усебеларускага і гарадзкога зьезду прафсаюзаў.

Білеты атрымаць у Гарпрафсавеце.

ПРЭЗЫДЫУМ ГАРПРАФСАВЕТУ.

Менскі Гарадзкі Камітэт МОПР'у паведамляе ўсе ячэйкі МОПР'у Менскага раёну, што

2-я МЕНСКАЯ ГАРАДЗКАЯ КАНФЭРЭНЦЫЯ МОПР'у

адбудзецца 29 сакавіка, у 6 гадз. вечара, у клюбе мастакоў (Університэцкая 12).
Мандаты можна атрымаць штодзенна ў гаркоме МОПР'у (Савецкая 87, 2-гі паверх) ад 10 гадз. раніцы да 3 гадз. дня і ад 7 да 9 гадз. веч.
Пасьля дзеляцтай частка—мастацкая.
Францыя—у 5 гадз.

МЕН. ГК МОПР'у.

Чырвоная Зорка — Гучавы мастацкі фільм ДЗЬВЕ СУСТРЭЧЫ драма ў 7 частках.
„Інтэрнацыянал". — Заменны фільм АБШАРПАНЫЯ ВЕТРАЗІ
ПРАЛЕТАРЫ. — Мастацкі фільм КАПІТАНСКАЯ ДАЧКА драма ў 8 част.
„СПАРТАК" — Амэрыканскі фільм НЕБАСКРОБ камэдыя ў 6 частках.

Беларускі дзяржаўны Інстытут прадзільных культур (у Горках) абвяшчае веснавы прыём студэнтаў на 1-шы курс. Заявы з усімі патрэбнымі згодна правіл прыёму, дакумэнтамі прымаюцца да 15 красавіка. Іспыты праводзяцца з 15 па 25 красавіка. Заняткі пачынаюцца з 3-га мая. Заявы з дакумэнтамі накіроўваюцца па адрасе: БССР, гор. Горкі, Інстытуту прадзільных культур.
Дырэктар Інстытуту ВАРАНЦОЎ.

МЕНСКАМУ ГАРАДЗКОМУ ПЛОДАГАРОДНАМУ ТРЭСТУ ПРЫ БЕЛКООПЛОДАГАРОДНІНЕ
Савецкая 43, тэл. 11-44

ПАТРАБУЮЦЦА:

1) ГАЛОЎНЫ БУХГАЛЬТАР,
2) 2 БУХГАЛЬТАРЫ,
3) Спэцыяліст па засолцы гурноў і квасацы капусты,
4) Спэцыяліст па буртаваньні сьвежай гародніны,
5) СТАТЫСТЫК,
6) САКРАТАР.

Галоўбуху прадстаўляецца кватэра ў горадзе.

ІНСТЫТУТ ПРАДЗІЛЬНЫХ КУЛЬТУР абвяшчае прыём курсантаў на падрыхтоўчыя пяці-месячныя КУРСЫ (у колькасьці 90 асоб). Паступаючыя павінны мець адукацыі не ніжэй 7-горкі. Заявы прымаюцца да 15 красавіка. Заняткі пачынаюцца з 15 красавіка 1932 г. Заявы з дакумэнтамі накіроўваюцца па адрасе: БССР г. Горкі, Інстытуту прадзільных культур.
Дырэктар Інстытуту Варанцоў.

Аддзелу ачысткі ГЖС

ПАТРЭБНЫ

асанізатары і мусаршчыкі.

Заработак: бачкарам — да 200 р. у месяц, мусаршчыкам — да 150 р. у месяц.
Рабочыя забясьпечваюцца інтэрнатам.
Адрас канторы: Камсамольская, 15, аддзел ачысткі Гаржыльсаюзу.

ПАТРАБУЕЦЦА гідраўлічаскі прэс сумесна з насосам даўленьнем да 300 атмасфэр, або без насосу. Разьмер пліт прэсу 350х630, або 600х600.
Фабрыка „Чырвоная Барэзіна", Нова-Барысаў.

Кіраўніцтва папраўча-працоўнымі установамі і калектыў работнікаў з вялікім жалем паведамляюць аб сьмерці старэйшага працаўніка-начальніка Полацкага Дорпраўгаду тав. КУЗЬМІЦКАГА Янкі Юльяновіча і выказваюць спачуваньне сям'і нябошчыка.

МАШЫНІСТКА шукае месца. Паведаміць пісьмова: Нова-Маскоўская № 1/13, кв. 11, Вакман для Г.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

Выкананьне прамфінпляну прамысловасьцю трэсту „Белдрэў" за дзьве дэкады сакавіка

Паводле вестак трэсту «Белдрэў», прамысловасьць трэсту выканала месячную вытворчую праграму за дзьве дэкады сакавіка на 59,5 проц., у тым ліку па лесапільні — 63,8 проц., па фанэры — 48 проц., па пажавой фанэры — 36,5 проц., па стандартных дамох — 51,9 проц., па паркеце — 62,4 проц., па гнутай мэблі — 49,3 проц., па сталярнай мэблі — 73,3 проц., па буддэталях — 60,2 проц. і па стружцы — 45,8 проц.

Пасобныя заводы далі наступнае выкананьне пляну: Бабруйскі дрэвапрацоўны камбінат — 54.8 проц., завод імя Фрунзэ — 65,4 проц., імя Варошыла — 58,8 проц., «Спартак» — 63,5 проц., імя Халтурына — 98,3 проц., віцебскі лесазавод — 66,9 проц., «Калпрацэ» — 74,9 проц., «Сацыялізм» — 56.2 проц., завод імя Томскага — 58,2 проц., «Адраджэньне» — 63,5 проц., «Камінтэрн» — 60,7 проц., завод імя Молатава — 70,2 проц., «Пралетары» — 36 проц., полацкі лесазавод — 33,1 проц.

***

Сельгасмашыны

23 сакавіка завод Гомсельмаш выпусьціў 34 сіласарэзкі — 141,7 проц., 19 сячкарань — 135,7 проц., 8 бульбамыек — 100 проц., 18 бульбасартовак — 128,6 проц., 5 канюшнасартовак — 200 проц. заданьня.

Папера

25 сакавіка Шклоўская папяровая фабрыка «Спартак» выпусьціла 5,7 тоны паперы, што складае 42,3 проц. заданьня.

Абутак

23 сакавіка Віцебская абутковая фабрыка імя Лекерта выпрацавала 3.400 пар абутку, што складае 102,7 проц. заданьня. 24 сакавіка фабрыкай выпрацавана 3.290 пар, або 99,4 проц. заданьня.

***

25 сакавіка Менская абутковая фабрыка выпрацавала 4.286 пар абутку, або 106,3 проц. заданьня. 26 сакавіка фабрыкай выпрацавана 4.064 пары, або 100,8 проц., 27 сакавіка — 4.152 пары, або 103 проц.

***

За 5-ю пяціднеўку сакавіка Магілеўская рымарна-сядзельная фабрыка выпусьціла прадукцыі на 90.283 руб., што складае 98,2 проц. заданьня.

Швэйныя вырабы

З 21 па 25 сакавіка швэйная фабрыка «Кастрычнік» выпусьціла прадукцыі на 506.260 руб., што складае 106,4 проц. пляну.

***

За пятую пяціднеўку сакавіка фабрыка «Сьцяг індустрыялізацыі» выканала вытворчае заданьне на 103,9 проц.

***

За гэты-ж час фабрыка «8-е сакавіка» дала выкананьне вытворчага заданьня на 101,9 проц.; фабрыка «Прафінтэрн» — на 96 проц.

***

З 21 па 25 сакавіка аўчына-футровы завод «Пралетарскі шлях» выпусьціў прадукцыі на 100.580 руб., што складае 75 проц. месячнага пляну.

Дакладная мэханіка

За пятую пяціднеўку сакавіка віцебская акулярная фабрыка выпусьціла прадукцыі на 81.291 руб., што складае 126,6 проц. заданьня.

Іголкавыя сырабы

За пятую пяціднеўку сакавіка віцебская іголкавая фабрыка выпусьціла прадукцыі на 30.665 руб., што складае 129,5 проц. заданьня.

Менск, друкарня «Зьвязды».

Галоўлітбел № 337.